Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КРАСАВІК 4 1933 г. № 74 (4618)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня унумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Гістарычны дакумант.
Прыпадак шаленства наймітаў Дзтэрдынга (4 стар.).
АДКАЖАМ НА АДОЗВУ ЗЬЕЗДУ БАЛЬШАВІЦКІМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ (1 стар.).
Партыйнае будаўніцтва — «У саўгасах «Курганы», «Брылёва» няма ўпартай барацьбы за гатоўнасьць да веснавой сяўбы (2 стар.).
КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ: Віт. Д. — Па-бальшавіцку змагацца за пралетарскі інтэрнацыяналізм (2 стар.).
Пра абавязковую вывазку гною на палі — Пастанова СНК БССР (3-я стар.).
Поўнасьцю ліквідаваць прарыў у дзяржаўных закупках збожжа! (3 стар.).
Тварам да калгасьніка-ўдарніка. (3 стар.).
ЗА МЯЖОЙ:
Паведамленьне ТАСС (4 стар.).
Налёт на гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Лейпцыгу (4 стар.).
Зьдзекі над савецкімі грамадзянамі працягваюцца (4 стар.).

АДОЗВА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ—ПРАГРАМА БАРАЦЬБЫ ЗА ПЕРАМОГУ НА ПАСЕЎНЫМ ФРОНЦЕ

АДКАЖАМ НА АДОЗВУ ЗЬЕЗДУ БАЛЬШАВІЦКІМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ!

ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМАНТ

«Мы, калгасьнікі, абавязаны палепшыць сваю гаспадарку, павысіць якасьць сваёй работы. Вось тады і ўдасьць нам, як указаў наш т. Сталін, падняцца яшчэ вышэй, падняць усіх калгасьнікаў — і былых бедняко ў і былых серадняко ў — да узроўню заможных».

Так пішуць у сваёй адозве да ўсіх калгасьнікаў дэлегаты першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Лепшыя, перадавыя людзі новай калгаснай вёскі, калгасьнікі-ўдарнікі, падводзяць вынікі калгаснай буйноўлі, гістарычным перамогі справы калектывізацыі.

«Мінуў той час, калі наш селянін абіраў парочі ў памешчыка, кулака і баюцеця. Цяпер наш селянін — зацікаўлены гаспадар, жыве ў калгасе, мае ў сваім распарадканьні трактары, с.-г. машыны, насенфонды».

У гэтых простых, але поўных вялікага сэнсу і значэньня словах, зьезд паказвае, што далі партыя, савецкая ўлада, што далі калгасы працоўнаму селяніну.

Але перадавікі калгаснай вёскі ня толькі падводзяць вынікі. Яны прадугледжваюць вялікія закапрабаваньні да ўсіх калгасьнікаў БССР. Першае і асноўнае запрабаваньне, якое яны абавязваюць выканаць і патрабуюць яго выкананьня ад другіх, — заключаецца ў тым, каб па-бальшавіцку правесьці веснавую сяўбу, выканаць пасеўнае заданьне ўраду і партыі, засеяць у калгасным сэктары 1.225 тыс. га ня толькі па колькасьці, але і па якасьці, каб ужо ў гэтым годзе атрымаць з гэктара ня менш 9 цэнтн. збожжавых, 100 цэнтн. бульбы і 2,4 цэнтн. ільнавалакна.

Што для гэтага патрабуецца?

Зьезд калгасьнікаў-ударнікаў у сваёй адозве дае дасканалы і выразны адказ.

— Для гэтага ня трэба эканомічаць і крыўдзіць сваіх суседзяў, як было пры аднаасобнай гаспадарцы. Для гэтага патрабуецца толькі, як гаварыў наш любімы правадыр т. Сталін, адно — каб мы, калгасьнікі, працавалі сумленна, павышалі ўраджайнасьць і прадукцыйнасьць жывёлагадоўлі, дзялілі калгасныя даходы па працы, берагчы калгаснае дабро. Для гэтага трэба ўмацоўваць калгасы, павысіць пам узорны парадак, бязьлітасна вынішчаць адтуль пралезьлых кулакоў, пасукулачнікаў, лодыраў і гультаёў.

Адозва — пікрока красупуп у масы, у кожны калгас, у кожную брыгаду і стайню, у кожную калгасную хату, перагарнуць адозву ў баявую зброю арганізацыі сяўбы, — вось сёньня ўдарны лёзунг усёй масава-палітычнай работы на вёсцы.

Нашы партыйныя арганізацыі, кожны камуніст прымуюць зараз баявы экзамэн. Ад іх кіраўніцтва, ад іх уменьня стаць на чале мас, павесьці іх за сабой будзе залежаць наслядкоае правядзеньне першай сяўбы другой пяцігодкі.

Між тым яны маюм ня мала фактаў, калі канкретнае кіраўніцтва, канцэрэтная работа падмяняецца гаспраўлерствам, пагарэвым морам.

Возьмем Мсціслаўскую МТС. Работа большасьці аграномаў МТС скандэнтравана ў чатырох сьцянах кабінэтаў. На месцы ў калгасы яны амаль не выяжджаюць. Аб падрыхтоўцы да зьвышраньняй сяўбы ў МТС проста забылі. 50 проц. вытворча-фінансавых плянаў калгасаў яшчэ не зацьверджаны і ляжаць у кашэлях. Канкретную работу, жывую справу людзі падмянілі тут балбатнёй і бюракратычнай пісаніной.

Або возьмем Хойніцкую МТС. 20 калгасаў раёну ўжо распачалі зьвышраньняю сяўбу. Праз дзень-два выйдуць у поле і ўсе іншыя калгасы. А ў МТС нават... няма вытворчых плянаў.

Вось з такім бюракратычным кіраўніцтвам, якое падмяняе жывую справу паперай, якое адгародзілася ад калгасаў кітайскай сьцяной, трэба змагацца бязьлітасна.

Старобінскі райземаддзел у сваіх тэлеграфных зводках, што дасылаюцца Наркамзему, увесь час бубніць, што па калгасах насеньне збожжавых сабрана на 90 проц., тэхнічных — на 93 проц. і бульбы — на 95 проц. Ніадзіна была праведзена праверка, якая паказала, што ў калгасе «Чырвоны хлебароб» не хапае 346 цэнтн. бульбы, а ў калгасе «Чырвоная зорка»—887 цэнтн. Толькі па гэтых двух калгасах насеньны фонд бульбы на раёну зьменшыўся на 8 проц. А райземаддзел лічыў, што ў гэтых калгасах з насеньнем добра.

Як-жа дапамагаюць калгасам мясцовыя кіруючыя работнікі. Нядаўна ў калгас «Бальшавік» прыехаў старшыня Старобінскай РК-РСІ. Ён прабыў у калгасе адзін вечар, сабраў калгасьнікаў, пагутарыў з імі, запытаў пра недахопы, якія ёсьць, і пазаўтра раніцою таксаў. Ніякіх канкрэтных указаньняў аб падрыхтоўцы да сяўбы ён не зрабіў. Характэрна, што ў гэтым калгасе значная частка сельска-гаспадарчага інвэнтару ў гэты час яшчэ ня была адрамантавана. Або вось другі факт. Калгас «Чырвоны хлебароб», пра які мы гаварылі вышэй, нядаўна наведаў старшыня старобінскага РВК. Ён прыехаў, пахадаў па калгасным дварэ, перакінуўся некалькімі фразамі са старшынёй калгасу і паехаў. У гэты-ж самы час у калгасе разбазарылі насеннную бульбу. З такім бюракратычным верхагляцтвам, такімі мэтадамі кіраўніцтва пара ўжо раз і назаўсёды пакончыць.

Або возьмем пытаньне пра аднаасобнікаў. Ва ўмовах Беларусі аднаасобнікі адыгрываюць значную ролю ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

«Інтарэсы барацьбы з рашткамі кулацтва, са шкодніцтвам, з раскрадальнікамі грамадзкай уласнасьці, інтарэсы ўмацаваньня калгасаў патрабуюць ад нас, калгасьнікаў, устанавіць больш правільныя адносіны з працоўнымі аднаасобнікамі, устанавіць адзіны фронт барацьбы супроць ворагаў працоўнага народу, адзіны фронт барацьбы за посьпех веснавой сяўбы».

Да гэтага заклікаюць калгасьнікаў БССР перацавікі калгаснай буйноўлі.

Мы яшчэ і зараз пакідаем немала фактаў грубага ігнараваньня аднаасобнікаў. У Віцебскім раёне, напрыклад, аднаасобнікі складаюць 40 проц., а Віцебскі райземаддзел зусім скінуў аднаасобнікаў з рахунку, як быццам іх ня існуе на сьвеце. Ва ўсіх дырэктывах пра аднаасобнікаў успаміноюць між іншым. А ў выніку ў сельсавеце глядзяць на аднаасобніка, як на нічога ня варт ую дэталь. Ігнараваньне аднаасобнікаў даходзіць да таго, што старшыня і сакратар Шумянскага сельсавету ня ведаюць, колькі зямлі знаходзіцца ў карыстальні аднаасобных гаспадарак.

— Можа 600, а можа і 700 гэктараў — вось адказ сакратара сельсавету.

Ня ўсе аднаасобнікі ведаюць, дзе ім сеяць, бо ёсьць такія, якім яшчэ не адведзена зямля. У Старобінскім раёне кіраўніцтва аднаасобным сэктарам заключаецца ў тым, што райземаддзел і сельсаветы ўзялі ў аднаасобнікаў расьпісі аб колькасьці насеньня, а вось, як хаваецца насеньне — не праверялі. Сярод аднаасобнікаў не вядзецца ніякай сапраўна-растлумачальнай работы. Новы закон аб пастаўцы збожжа дзяржаве сярод аднаасобнікаў ня апрацыраваны.

Зусім ясна, што ўсе савецкія, партыйныя і калгасныя арганізацыі абавязаны зараз-жа нагнаць прапушчаны час і падрыхтаваць аднаасобнікаў да сяўбы.

Бальшавіцкая падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі складаецца з наступных асноўных зьвеньняў — своечасовага і поўнага збору і ачысткі насеньня, падрыхтоўкі цягавай сілы і правільнай арганізацыі працы. Спалучэньне гэтых зьвеньняў з рацыянальнымі ўмовамі правядзеньня сяўбы — умацаваньнем пастаяннай брыгады, барацьбой за працоўную дысцыпліну — вось той вагар, пры дапамозе якога будзе з посьпехам праведзена сяўба і гаспадарка ўмацаваны калгасы.

Сабраць і ачысьціць насеньне, падрыхтаваць калі, своечасова і арганізаванна выйсьці ў поле, выкрыць усе кулацкія манэўры, бязьлітасна біць кулака і яго агентуру — вось праграма дзеньня, якую вызначылі лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі.

Зараз мала насеньня, трэба, каб сяўба была праведзена ачышчаным насеньнем, каб сеялі ня зьніжаючы нормы высеву, вызначаныя апрацаванымі. Зараз мала ўзараць, трэба ўзьняць зямлю на такую глыбіню, якую патрабуе тая ці іншая культура. Мала выканаць план пасеву, трэба пачаць сяўбу рана і закончыць у найкарацейшыя ўпчышчаныя тэрміны, каб дабіцца павышэньня ўраджайнасьці.

Пад сьцягам сацыялістычнага спаборніцтва, абвешчанага ўсебеларускім зьездам калгасьнікаў-ударнікаў, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, наперад, да рашучай перамогі на палёх веснавой сяўбы!

З ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ

МТС ПРЫСТУПАЮЦЬ ДА СЯЎБЫ

АСОБНЫЯ ІЛЬНАВОДЧЫЯ МТС РАЗГАРНУЛІ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ ІЛЬНУ ПЕРШАГА ТЭРМІНУ (ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ ІЛЬНУ ЎСТАНОЎЛЕНЫ ТРЫ ТЭРМІНЫ).

ПЕРШЫМІ ВЫШЛІ Ў ПОЛЕ НА ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ ІЛЬНУ 14 КАЛГАСАЎ ГОРАЦКАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ. УЖО ЗАСЕЯНА 20 ГЭКТАРАЎ. ПЛЯН ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ ІЛЬНУ, УСТАНОЎЛЕНЫ ДЛЯ ГОРАЦКАЙ МТС, СКЛАДАЕ 60 ГА. КАЛГАСЫ «АДКАЗ ШКОДНІКАМ», КОРШАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, «ЧЫРВОНЫ ТРАКТАР», МАКАРАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ І «НОВЫ ШЛЯХ» ЗАСЕЯЛІ ПА 3 ГЭКТАРЫ ІЛЬНУ.

ПАЧАЛАСЯ ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА ІЛЬНУ ТАКСАМА Ў ДУБРОВЕНСКАЙ, ТАЛАЧЫНСКАЙ, СУРАСКАЙ, ДРЫСЕНСКАЙ І ІНШЫХ МТС. КАЛГАСЫ ДУБРОВЕНСКАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ ЎЖО ЗАСЕЯЛІ 6 ГЭКТАРАЎ ІЛЬНУ, ТАЛАЧЫНСКАЙ — 22, СУРАСКАЙ — 5, КРУПСКАЙ — 6, ДРЫСЕНСКАЙ — 1 і МСЬЦІСЛАЎСКАЙ — 1. УСЯГО ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБОЙ ІЛЬНУ ЎЖО АХОПЛЕНА КАЛЯ 70 ГЭКТАРАЎ.

ПАЧАЛОСЯ МАСАВАЕ ВОРЫВА ПА КАЛГАСАХ ВУШАЦКАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ. КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНЫ ЎСХОД» І «ЧЫРВОНЫ МАЯК», МАСАРСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, УЗАРАЛІ 10 ГЭКТАРАЎ

АДКАЗВАЕМ ГЭКТАРАМІ

РАГАЧОЎ, 3.

ДЭЛЕГАТ ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ АД КАЛГАСУ ІМЯ КАЛІНІНА ЗРАБІЎ СПРАВАЗДАЧУ АБ РАБОЦЕ І ПАСТАНОВАХ ЗЬЕЗДУ НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ. У АДКАЗ НА АДОЗВУ ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКІ АБАВЯЗАЛІСЯ СВАЯ ЧАСОВА ПРАВЕСЬЦІ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЎШЫ ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ.

КАЛГАСЬНІКІ АДРАЗУ ПРЫСТУПІЛІ ДА КАНКРЭТНАЙ СПРАВЫ. ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ Ў КАЛГАСЕ ІМЯ КАЛІНІНА ПАЧАЛІСЯ ЯШЧЭ 30 САКАВІКА. УЗАРАНА 15 ГЭКТАРАЎ. ПАЛЯВОДЧАЯ БРЫГАДА ТАВ. ЗАВАДЗКАГА ЎЗАРАЛА 8 ГЭКТ., НА ЯКІЯ ВЫВЕЗЕНЫ МІНЭРАЛЬНЫЯ ЎГНАЕНЬНІ. 4-ГА КРАСАВІКА КАЛГАС ІМЯ КАЛІНІНА РАСПАЧЫНАЕ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ ІЛЬНУ І ЯЧМЕНЮ.

ПАЧАЛІСЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ І ПА ІНШЫХ КАЛГАСАХ РАГАЧОЎСКАЙ МАШЫНА - ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ. 2-ГА КРАСАВІКА ВЫШЛІ Ў ПОЛЕ КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ», ЛУЧЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, І КАЛГАС «БУДЗЁНАВЕЦ», СВОРЖЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» У ПЕРШЫ-Ж ДЗЕНЬ ВЫХАДУ Ў ПОЛЕ ЎЗАРАЎ 2 ГЭКТАРЫ. КАЛГАС «БУДЗЁНАВЕЦ» ЗАСЕЯЎ 2 ГЭКТАРЫ АЎСУ.

КАЛГАС „НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ" ВЫКОНВАЕ СВАЕ СЛОВА

СЛУЦАК, 3 (ПА ТЭЛЕФОНУ).

У ДНІ РАБОТЫ ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ КАЛГАС «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» РАПАРТАВАЎ ЗЬЕЗДУ АБ БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ ДА СЯЎБЫ. КАЛГАСЬНІКІ ДАЛІ СЛОВА ПРАВЕСЬЦІ ПЕРШУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ СЯЎБУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ Ў САМЫ КАРОТКІ ТЭРМІН І РАШУЧА ЎЗЬНЯЦЬ УРАДЖАЙНАСЬЦЬ СВАІХ КАЛГАСНЫХ ПАЛЕЎ.

ЗАРАЗ КАЛГАС «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» НА СПРАВЕ ВЫКОНВАЕ СВАЕ СЛОВА. КАЛГАС ПРЫСТУПІЎ ДА ВОРЫВА І РАНЬНЯЙ СЯЎБЫ ЯРАВЫХ. 1 КРАСАВІКА ЗАСЕЯНЫ 2 ГЭКТАРЫ АЎСА. У ТОЙ-ЖА ДЗЕНЬ КАЛГАС ПАЧАЎ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ ІЛЬНУ.

***

СТАРОБІН, 3 (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

КАЛГАСЫ АДЗІН ЗА АДНЫМ ВЫХОДЗЯЦЬ У ПОЛЕ. РАНЬНЯЯ СЯЎБА РАЗГОРТВАЕЦЦА. УЗАРАНЫ І ЗАСЕЯНЫ ПЕРШЫЯ ГЭКТАРЫ.

КАЛГАС ІМЯ БУДЗЁННАГА ЗАСЕЯЎ 2 ГЭКТАРЫ АЎСА. У КАЛГАСЕ «ПЕРШЫ МАЙ» ПАЧАЛАСЯ ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА БУЛЬБЫ. УЖО ЗАСЕЯН 1 ГЭКТАР. КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ ПАГРАНІЧНІК» ЗАСЕЯЎ 2 ГЭКТ. КАНЮШЫНЫ. ТЭМПЫ ВОРЫВА І РАНЬНЯЙ СЯЎБЫ НАРАСТАЮЦЬ.

***

ПАРЫЧЫ. 2.

30 САКАВІКА Ў РАЁНЕ ПАЧАЛАСЯ РАНЬНЯЯ СЯЎБА. ПЕРШЫМІ РАЗГАРНУЛІ ВОРЫВА І СЯЎБУ КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА», «НОВЫ БЫТ» І ІМЯ ВАРАШЫЛАВА. 1-ГА КРАСАВІКА ВЫШЛА У ПОЛЕ ЯШЧЭ 12 КАЛГАСАЎ.

ВЫВЕЗЬЦІ ГАРУЧАЕ!

У паўднёвых раёнах ужо разгарнулася сяўба раньніх яравых культур. Праз 10-12 дзён масавая сяўба разгорнецца на ўсёй рэспубліцы.

Сур'ёзнейшую ролю ў падрыхтоўцы трактарнага парку да сяўбы адыгрываюць завоз, выбарка і заліўка гаручага.

Да 26 сакавіка па сыстэме наркамзему заліта толькі 78 проц. наяўнай тары і выбрана гаручага 28,4 проц. плану.

Па сыстэме саўгасаў заліта 46 процантаў наяўнай тары і выбрана 20 проц. гаручага.

Завоз гаручага ў БССР узмацніўся. Да 20 сакавіка адгружана 392 цыстэрны газы пры пляне на сакавік у 449 цыстэрнаў.

Па 40 складах Белкаапсаюзу да канца першай пяцідзённкі сакавіка заставалася гаручага 127,2 тоны, да канца трэцяй пяцідзённкі—337,2 тоны, а да канца пятай—889. Такім чынам, рэшткі гаручага на складах растуць. Прычыны—дрэнная выбарка і заліўка газы.

Па 18 складах нафтагандлю да канца першай пяцідзённкі заставалася 849 тон, а да канца пятай гэта колькасьць узрасла да 1.138, прычым выбрана за 5 дзён толькі 128 тон.

Слуцкая МТС не загатовіла тары пад гаручае і ня выканала прапановы камісіі РККРСІ аб пабудове спэцыяльнага рэзэрвуара.

Хойніцкая МТС падрыхтавала цыстэрн толькі на 8 тон і бочак на 5 тон. Патрэба-ж у гаручым складае 90 тон.

Путчынская МТС ня вывезла ні ад ной тоны, спасылаючыся на тое, што... далёка язіць.

Даманавіцкая МТС не завезла гаручых і змазачных матар'ялаў. Дырэкцыя знайшла тыя-ж самыя «аб'ектыўныя прычыны»—бліжэйшая станцыя закрыта, прыдзецца далёка вазіць...

Гарадоцкая МТС пры пляне завозу ў 96 тон да апошніх дзён не вывезла нічога. Дубровенская пры пляне ў 128 тон ня вывезла ні адной тоны. Лёзьнянская з 174 тон вывезла толькі 9, Пухавіцкая з 104—5 і г. д.

Падамо яшчэ некалькі фактаў. Дырэктар Аршанскага сьвінаводтросту тав. Аскерка ня прыняў ніякіх мер, каб заключыць дагавары з гаспадарчымі арганізацыямі на дастаўку гаручых і змазачных матар'ялаў.

Птушкатраст дае весткі, што зэлта 170 проц. наяўнай тары. Рыбгана-ж гаручага толькі... 8,6 проц. плану. Упаўнаважаны НК саўгасаў не кіруе гэтай справай—весткі ад трэстаў і саўгасаў паступаюць вельмі дрэнна, аднак, ніякія меры не прыняты.

Наркамзем таксама ня ведае, што робіцца на мясцох. Сэктар мэханізацыі НКЗ анэруе старымі зводкамі. Калі запытаць у сэктары, якое становішча на мясцох, работнікі толькі бясьсільна разводзяць рукамі.

Дырэктар Збожжатрактарацэнтру тав. Дубоўскі бездапаможна заяўляе, што пры цяперашнім становішчы з улікам паступленьня і заліўкі гаручага ніяк нельга анэрацыйна кіраваць падрыхтоўкай да сяўбы.

Уся справа цяпер—у баявой работе МТС на мясцох. Іх неадкладная задача — падрыхтаваць усю патрэбную тару і поўнасьцю ня заліць. Б.

РЭЧЫЦКАЯ ШТУРМАЎШЧЫНА

РЭЧЫЦА, 3 (Наш кар.).

Некаторыя калгасы раёну прыступілі да палявых работ. Пачалося ворыва, напрыклад, у паасобных калгасах Кармянскага і Баравікоўскага сельсаветаў.

Як раён падрыхтаваўся да сяўбы? Дрэнна, ганебна дрэнна. Работа раённых арганізацый знаходзіцца ў рэзкім канфлікце з падзор'ем. Сыстэма гэтай работы—фыўкі, шуміха, штурмаўшчына. Людзі сядзяць і спакойна чакаюць, пакуль прарывы на тых ці іншых вучастках падрыхтоўкі да сяўбы настолькі пагалыбяцца, што трэба біць трывогу. І тады пачынаецца мітусьня. Абвяшчаюцца штурмы, паходы, а справы па-ранейшаму ня відаць.

А вось і вынікі такой штурмаўшчыны. Зараз — на пароге масавай сяўбы — у раёне ня скончана ссыпка насеньня. Калгасы ссыпалі насенфонды па аўсу толькі на 70,7 проц. Пшаніца ссыпана ўсяго на 80,9 проц., бульба — на 80,3 і г. д.

Рэчыцкі райземаддзел ўжо ня раз быў пад абстрэлам цэнтральнага друку за апартуністычную бязьдзейнасьць. Раённыя кіраўнікі, аднак, ня прынялі ніякіх мер. Людзі пачулі, што самае лепшае, гэта прамаўчаць. Калегі і цяпер, на сёньнішні дзень — ніякіх зьмен. Райземаддзел многа шуміць, многа балбоча, але, як і раней, нічога ня робіць.

У калгасах «1 мая», Дзяміхоўскага сельсавету, «Гігант», Холмічкага, «Чырвоная камуна», Нахаўскага, і інш. злачынна правалена ссыпка насенфондаў. Гэтыя калгасы фігуруюць на кожным пасяджэньні або нарадзе ў райкоме, райземаддзеле і г. д. Іх, гэтыя калгасы, у тысячны раз называюць зрыўшчыкамі сяўбы, ганьбяць, а пасеньне па-ранейшаму ня ссыпаецца.

Уніжнуць адказнасьці, застрахавацца алілюйскай балбатнёй, ухваліць грозную пастанову і тут-жа пра яе забыць, — вось што ўвайшло ў моду ў Рэчыцкім раёне.

Возьмем для прыкладу ў першую чаргу райком і РКК. Колькі раз яны ставілі пытаньне аб бязьдзейнасьці райземаддзелу — цяжка падлічыць. Аднак, кожны раз прымаецца адна і тая-ж пастанова: напярэдадні абавязаць, дамагчыся нескладзіцы пералому і г. д., і г. д.

Так робіцца і цяпер. Нядаўна РКК КП(б)Б зноў (у каторы раз!) абмеркавала даклад райземаддзелу. Факты фігуравалі тыя-ж самыя: насенфонды ня ссыпаны, інвэнтар не адрамантаваны і г. д. І зноў робіцца чарговае пастанаўленьне: дабіцца пералому...

Як-жа ў Рэчыцы дабіваюцца гэтага пералому? Аб насенфондах мы ўжо гаварылі. Ня лепш і па іншых раённых вучастках. Сельгасінвэнтар, напрыклад, адрамантаваны толькі на 80 проц.

А вось, як у раёне думаюць павышаць ураджайнасьць. Пасталоў, абяцаньні, рэзалюцыі па гэтым пытаньні — мора. А справы? Даведаўся, што ў калгасах ачыстка насеньня правядзена ўсяго на 80 проц. Гапебнейшы зрыў па аднаасобным сэктары: плян ачысткі выкананы ўсяго на 4 проц. Лічбы выкананьня пляну па вывазцы гною проста сорамна называць. Плян выкананы ўсяго на 1 проц.

Аднаасобны сэктар займае ў раёне 73 проц. Раённыя арганізацыі, аднак пра аднаасобніка проста забылі. У цэлым радзе сельсаветаў да аднаасобнікаў яшчэ і зараз не даведзены цьвёрдыя пасеўныя абавязацельствы. У Васілевіцкім, Падлескім і іншых сельсаветах аднаасобнікам нават не адведзена зямля. Яны і зараз яе не маюць.

Усё гэта скарыстоўваюць кулацкія элементы. Яны разгортваюць шалёную агітацыю за сабатаж сяўбы. Кулацкая агітацыя не сустракае патрэбнага адпору. Адсюль і вынік. Сьцяна страхавых фондаў пад пагрозай. У сымым буйным сельсавеце раёну — Артукоўскім — ня ссыпана ні адной грама насеньня. Тое-ж у Падлескім, Сьвярыдаўскім, Дзяміхоўскім і ў іншых сельсаветах.

Вось яны, вынікі рэчыцкіх штурмаў. Райком, відавочна, упэўнены, што засеяць зямлю клін можна пры дапамозе адных прыгожых пастаноў... Д.

МАЙСТРЫ АШУКАНЧЫХ ЗВОДАК

МАГІЛЕЎ, 3. (Наш кар.)

У сакавіку Магілеўская МТС, так сказаць, праславілася свае ганебнейшымі тэмпамі падрыхтоўкі да сяўбы. Гэта сумная рэпутацыя мала чаму навучыла раённыя арганізацыі і, у першую чаргу, дырэкцыю МТС.

І зараз, на сёньнішні дзень, падрыхтоўка да сяўбы праводзіцца зусім дрэнна. Даволі ўказаць, што калгасы раённай МТС, яшчэ ня скончылі ссыпкі насенных фондаў. Плян выкананы толькі на 84 проц.

Яшчэ горш праходзіць аўдытка і пратручваньне насеньня. Да 1 красавіка калгасы ачысьцілі толькі 53 проц. насенных фондаў. У калгасах «Авангард», «Першы май», «Чырвоны баец», «Сацыяліст» і «Гігант» не ачышчана нічога. Пшаніца ссыпана ўсяго на 80,9 проц., бульба — на 80,3 і г. д.

Так робіцца і цяпер. Пядаўна РКК КП(б)Б зноў (у каторы раз!) абмеркавала даклад райземаддзелу. Факты фігуравалі тыя-ж самыя: насенфонды ня ссыпаны, інвэнтар не адрамантаваны і г. д. І зноў робіцца чарговае пастаноўленьне: дабіцца пералому...

Як-жа ў Рэчыцы дабіваюцца гэтага пералому? Аб насенфондах мы ўжо гаварылі. Ня лепш і па іншых раённых вучастках. Сельгасінвэнтар, напрыклад, адрамантаваны толькі на 80 проц.

У чым справа? Гутарка-ж ідзе пра сельсавет, як і райком, і райвыканком, і райКК рэкамэндуюць, як самы лепшы і перадавы.

А справа ў тым, што раённыя арганізацыі прашляпілі кулацкую палітыку, якую праводзіў дый праводзіць Вяцерскі сельсавет. Сакратар ячэйкі Пашкоў і старшыня сельсавету А. Сураўёў зрасьліся з кулацкімі элементамі, старанна пакрываючы іх контр-рэвалюцыйныя справы.

Сельсавет ганарыцца высокім процантам калектывізацыі. Гэты процант сапраўды высокі — сельсавет калектывізован на 93 проц. Але гэта лічба была дасягнута вельмі проста. У Вяцерскім сельсавеце шырока расчынілі дзьверы калгасаў для кулацка-шкодніцкіх элементэў. Прымалі ўсіх, бяз усякага разбору, бяз усякай праверкі.

І ў выніку ў калгасы сельсавету пралезьлі кулацкія шкодніцкія элементы.

Да самага апошняга часу, напрыклад, у калгасе Цотава сядзелі былыя памешчыкі Кажарскія, якія мелі да рэвалюцыі некалькі соцень гэктараў зямлі. У калгас «Будаўнік сацыялізму» пралезьлі кулакі Сіняковы, якія мелі па 90 га зямлі, дзесяткі коняй і эксплёатавалі батракоў.

Цяпер нават старшыня сельсавету і сакратар парт'ячэйкі прымушаны прызнаць, што такія калгасы, як «Блажэўшчына» і «Лепшая доля» арганізаваны пераважна з кулацкіх гаспадарак. У гэтых калгасах кулакі сядзяць і ЗАРАЗ. У калгасе «Лепшая доля», напрыклад, яшчэ і цяпер арудуюць кулакі Дробуш, Кухарэнка і інш., якія мелі па 30-40 га зямлі і эксплёатавалі наёмную рабочую сілу.

Чаму іх не выганяюць прэч з калгасу? Як магло здарыцца, што ў сельсавеце дапусьцілі арганізацыю кулацкіх «калгасаў». Для адказу Даволі падаць адзін факт. Пашкоў сыстэматычна п'янствуе ў кулака Дробыша. Ну і як тут не дапамагчы субутэльніку.

Старшынёй калгасу «Лепшая доля» быў буйнейшы мясцовы кулак Панушкін, якога ўвесь час актыўна абаранялі і падтрымлівалі і старшыня сельсавету, і сакратар парт'ячэйкі.

Цяпер, праўда, у сельсавеце пачалася чыстка калгасаў ад кулацка-шкодніцкіх элементаў. Але як яна праводзіцца. У радзе выпадкаў выключаюцца з калгасаў не кулацкія элементы, ня шкоднікі, а сераднякі. Напрыклад, выключылі аднаго серадняка з калгасу Малыя Ліпавічы. Да рэвалюцыі гэты серадняк быў бедняком і толькі пры савецкай уладзе атрымаў зямлю. Ніколі ён не карыстаўся наёмнай сілай і сам працаваў на сваёй зямлі. А за тое пры дапамозе сакратара парт'ячэйкі Пашкова кулацкія элементы пакідаюцца ў калгасах. Паўтараем, у калгасе «Блажэўшчына» і ў калгасе «Лепшая доля» яшчэ і зараз сядзяць былыя буйныя кулакі Кажарскія, Дробышы, Кухарэнкі і інш.

Так выглядае Вяцерскі сельсавет у сапраўднасьці. Як усё-ж магло здарыцца, што да самага апошняга часу, пакуль не ўмяшалася ЦКК, кулацкае кіраўніцтва сельсавету ня было выкрыта? Дзе-ж быў райком партыі раней?

Райком на ведае, што робіцца на мясцох, райком не правяраў работу сельсавету, сьлепа давяраючы кулацкім агентам — Сураўёву і Пашкову.

Той факт, што і цяпер у калгасах сельсавету сядзяць кулакі, што ачыстка калгасаў праводзіцца ляпа нерашуча і невыстарчальна, яркі сьведчыць аб тым, што раённы камітэт яшчэ не зрабіў усіх патрэбных вываадаў з гэтай справы.

Р. Д.

ПРАЗ РУЖОВЫЯ АКУЛЯРЫ

І ў райкоме, і ў РВК, і ў райземаддзеле самай высокай думкі пра Вяцерскі сельсавет.

— Гэта лепшы сельсавет у Чашніцкім раёне — у адзін голас заяўляюць работнікі РК і РКК КП(б)Б.

Ад раённага цэнтру — Чашнік — да Вяцерскага сельсавету рукой падаць. Што робіцца, аднак, у гэтым сельсавеце — у раёне ведаюць менш за ўсё. У мінулым сельсавет выканаў хоць і са спазьненьнем пляны загатовак. Гэта настолькі супакоіла раённых кіраўнікоў, што яны махнулі рукой на Вяцерскі сельсавет.

— Сельсавет сам спраўляецца з усімі заданьнямі, там усё добра, — былі пераконаны раённыя арганізацыі.

Што-ж ёсьць на справе? Як зараз сельсавет падрыхтаваўся да сяўбы? Падамо толькі некалькі найбольш яркіх фактаў.

Вяцерскі калгас знаходзіцца пад бокам сельсавету. А вось што ў ім робіцца. І да гэтага часу калгас яшчэ ня ссыпаў насеньня на 11 га яравога клину. Ахова насеньня зусім не арганізавана. Інвэнтар не падрыхтован. Рамонт боран, напрыклад, яшчэ нават не пачынаўся. Не адрамантаваны таксама калёсы і хамуты. Коні абязьлічаны. Конюхі мяняюцца амаль кожную пяцідзённку. Абязьлічка дае свае вынікі. З 40 калгасных коняй 12 непрыгодны да работы.

Або возьмем Гразінскі калгас. Ён таксама знаходзіцца ля самага сельсавету. Калгас зусім не падрыхтаваўся да палявых работ. Коні даглядаюцца злачынна. З 16 рабочых коняй 10 даведзены да такога стану, што зараз іх прышлося вызваліць ад работы. І такія факты можна памножыць.

Лінейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Партыйнае будаўніцтва

У САЎГАСАХ „КУРГАНЫ“, „БРЫЛЁВА“

НЯМА УПАРТАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Узьняць авангардную ролю камуністаў у саўгасах

Саўгасы ўступаюць у найбольш адказны перыяд работы, перыяд правядзеньня першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі. Асаблівасьці сёлетняй веснавой пасеўнай кампаніі ў тым, што яна праводзіцца з асобым упорам на высокія якасныя паказьнікі працы, за высокі ўраджай.

У выкананьні гэтай баявой задачы саўгасам прыналежыць вядучая роля. Справа гонару камуністаў, працуючых у саўгасах,—забясьпечыць гэту вядучую ролю з тым, каб паказаць вакольным калгасам сапраўдныя ўзоры ўжываньня агратэхнікі і навукі, узоры высокай прадукцыйнасьці працы на буйнай сацыялістычнай гаспадарцы.

Між тым партыйныя ячэйкі многіх саўгасаў яшчэ і па сёньняшні дзень не ўсьвядомілі тэй вялізарнай адказнасьці, якая ўскладаецца на іх партыяй, не ўсьвядомілі, што асноўным зьместам іх работы ў цяперашні момант павінны быць пытаньні выканьня жыцьця, пытаньні, якія забясьпечваюць пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы. Зьмешчаныя сёньня допісы аб саўгасах «Брылёва» (Гомельскі раён), «Курганы» (Менскі раён) і імя 14 партызан (Слуцкі раён) сыгналізуюць аб неадпушчальнай благадушнасьці і бязьдзейнасьці партыйных ячэек гэтых саўгасаў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Асноўны недахоп у тым, што тут партыйныя ячэйкі не заняли свайго месца ў арганізацыі вытворчасьці. Камуністы не праяўляюць вядучай ролі ў барацьбе за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны, за ўкараненьне ў працу мэтазадкі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Грош цана такому камуністу, які, працуючы па вытворчасьці, сваю ролю абмяжоўвае толькі пасьвечаньнем сходаў і выступленьнямі на гэтых сходах, а на справе не зьяўляецца перадавіком на вытворчасьці, не ўваходзіць ва ўсе дэталі працы і жыцьця саўгасу, не арганізуе рабочых беспартыйных мас на пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач партыі. Хібі можа такая ячэйка, як, напрыклад, ячэйка саўгасу «Брылёва», мець баль шавіцкі ўплыў на рабочыя масы ў сэнсе ўзьняцьця працуцыйнасьці працы, калі з 10 камуністаў, якія налічваюцца ў ячэйцы, толькі два зьяўляюцца ўдарнікамі, а многія з іх працуюць, нібы адбываючы падзёншчыну—«дзень правальніў і добра».

Яшчэ горш стаіць справа ў ячэйцы саўгасу «Курганы». Аліліюйнічына, апартуністычная самазаспакоенасьць, «очковтирательство» засланілі вочы ячэйцы на тыя абураючыя факты безгаспадарчасьці, якія маюць месца ў саўгасе, прытупілі яе рэвалюцыйную пільнасьць, у выніку чаго выкананьне саўгасам пляну веснавой сяўбы па стаўлена пад пагрозу зрыву.

Факты аб становішчы ў партячэйцы саўгасу «Курганы», дзе сакратаром быў буржуазны перараджэнец **Папкоў**, які рабіў антыпартыйныя ўчынкі пры садзейнасьці дзяржаўнага кантралёра **Міхалькова**, яшчэ раз напамінаюць аб неабходнасьці самага ўважлівага падбору кіруючых кадраў у саўгасах і сыстэматычнай праверкі выкананьня практычнага ажыцьцяўленьня на месцах дырэктыў партыі.

Надыходзіла веснавая сяўба—бая вы экзамэн для кожнай парт'ячэйкі. для кожнага камуніста, праверка іх бальшавіцкай здольнасьці змагацца за ажыцьцяўленьне пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) у справе палітычнага ўмацаваньня саўгасаў і павышэньня іх перадавой ролі па тэхнічным перабудаваньні і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі.

Па канкрэтнай рабоце, па выніках практычнага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва, па актыўнасьці ў барацьбе супроць кулацкіх элементаў, апартуністаў і буржуазных перараджэнцаў будзе ацэньвацца ў часе чысткі вартасьць кожнага камуніста быць членам бальшавіцкай партыі. Таму, на якім-бы вучастку працы не знаходзіўся камуніст, ён павінен з бальшавіцкай самаадданасьцю змагацца за справу партыі, спалучаць кожны крок сваёй дзейнасьці з агульнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, арганізуючы і вядучы за сабой рабочыя і працоўныя масы.

Саўгасы найбольш важны вучастак работы ў справе дальнейшай сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. **На гэтым вучастку ад кожнага камуніста партыя патрабуе гераічных узораў барацьбы, ударнай работы за поўную і своячасовую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.**

Іх застала вясна зьнянацку

Праз пекныя дзён пачынаецца масавая сяўба яравых. А саўгас **«БРЫЛЁВА» (Гомельскі раён)** не падрыхтаваўся. Не пакатагове плуг і рабочая сіла.

У красавіку месяцы саўгасу патрэбна 348 рабочых, а ў наяўнасьці ёсьць толькі 100. Рабочыя не рэмонтаваны ні брыгады. Партыйная ячэйка падрыхтоўкай рабочай сілы зусім не займалася. Ячэйка КП(б)Б не разглядала і такія пытаньні як правядзеньне вытворчых нарадаў да рабочых і ўвядзеньне сацыяўзаемнасьці.

Кіраўніцтва саўгасу не выкарыстала сапраўдную дарогу для выязкі гною. З патрэбных 2.372 тоны, вывезена 999. Дрэнна арганізаваны закладка перагнівальных рам. Трэба закласьці: позьніх—800, закладзена—120. Ранніх—400, закладзена—252. Насеньне не падрыхтавана. Не хапае бульбы на пробных 10 га, пыльні—на плошчу ў адзін га. Насеньне не праверана на ўсхожасьць, і захоўваецца яно дрэнна.

Сад (плошчай у 300 га) павінен быў ужо даўно быць абшчыканым ад вусеня. Да гэтага часу абшчынана ўсяго 45 проц.

Апрамантаваны інвэнтар яшчэ ня прыйшоў. Дырэкцыя і партыйная ячэйка толькі думаюць скалысці прыёмачную камісію.

Усе гэтыя пытаньні выпалі з-пад увагі партыйнай ячэйкі.

Ня лепш справа і з цягавай сілай. Коні прыведзены да агіднага становішча. 25 процантаў усёй цягавай сілы ня зможа працаваць на палёх веснавой сяўбы. З кароўнай справа так самы дрэнна. Ёсьць толькі грубыя кармы, а сакавітых няма зусім. Няма таму, што раней аб гэтым ніхто ня думаў. Запушчанасьць цягавай сілы тлумачыцца дрэнным абслугоўваньнем яе. Калгоспам пастаўлены старшы рабочы **ВУТКІН.** Ён дае коні каму папала і посьпіш прыкае іх не правяраючы. Бязгоўна, адказнасьць за гэта нясе ня толькі **ВУТКІН,** але і дырэктар **Лескавец** і яго намесьнік **Малашчанка.** Адказнасьць за цягавую сілу нясе і сакратар парт'ячэйкі **Краўчык,** і ўсе камуністы саўгасу.

Сеязваротаў яшчэ не зацьвердзжан, ёсьць толькі попярэднія пасёткі. Сам сакратар ячэйкі пав. Краўчык сурова заўважвае: «Што зробім з 10-ю камуністамі. Усяго два ўдарнікі...».

Сакратар ячэйкі Краўчык не забясьпечвае мабілізацыю камуністаў і рабочых мас на выпрыгнальнае непахопаў. Да рэчы, яго рэдка бачыць ня толькі ў саўгасе на пяць мінут і зноў пашоў. Куды, нікому невядома.

Ці можа такі сакратар пірвець ячэйкай, узьнімаць яе баяздольнасьць, мабілізоўваць масы на пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы? Бясспрэчна, не! І не кіруе. Да гэтага часу ячэйка не палічыла патрэбным абмеркаваць на бюро пытаньні: ці ўсё гатова да выхаду ў поле, ці ўсе камуністы стаяць на сваіх месцах, ці вядуць яны якую выхаваўчую работу. Масавая работа адсутнічае. Аб гэтым сьведчыць хоць-бы такі факт, што дагэтуль сярод рабочых яшчэ не распрацавана адозва ўсесаюзнага вызову калгасьніку-ударніку. Насьценныя газэты ў саўгасе не выходзяць.

Усё гэта гаворыць аб непрацаздольнасьці нясьці бюро партыйнай ячэйкі саўгасу **«Брылёва»** і не сакратара **Краўчыка.** Больш таго, тав. Краўчык займаецца «очковтирательством». У яго хапае сьмеласьці заявіць, што «ў нашым саўгасе ўсё ў парадку»...

Саўгас-гародны саўгас «Брылёва» да веснавой сяўбы **не** гатоў. Камуністы не арганізавалі падрыхтоўку. Іх застала вясна зьнянацку.

ПАПЧРЭЦКІ.

Сурова пакараць зрыўшчыкаў падрыхтоўкі да сяўбы

Вясна ўжо прышла. Зямля паказала свой твар. Зямля загаварыла:

— Я пакатагове...

Шмат дзе пачалася звышраньняя сяўба. А ў саўгасе **«Курганы»** (Менскі раён) абвешчана трывога...

— **Насеньня не хапае. Гной ня вывезен. Рамонт трактараў не закончан. Цягавая сіла не падрыхтавана. Вярбоўка рабочай сілы сарвана.**

Не хапае... ня вывезен... не закончан... Адна чорная пляма.

Ссыпана: 21 цэнтн. ячменю, 320 цэнтн. бульбы, 3,7 цэнтн. канопляны. А трэба: аўса 124 цэнтн., вікі 53, гарошку — 9,6, бульбы — 720, канопляны — 5,9, лубіну — 50.

Гною вывезена 175 вазоў. А трэба? Трэба—500.

Попелу трэба сабраць тры тоны. **Сабрана**—адна.

Трактараў ёсьць 4. Усе яны павінны быць адрамантаваны. Адрамантавана толькі 1. І той па-шкодніцку. Бацты падпыньніка ўстановлены старыя, з зусім папсаванай разьбою.

А коні? Коняй у саўгасе налічваецца 34. З гэтага ліку слабасільных — 22 (64 проц.).

Па парыяд веснавой сяўбы да шта ту ў 70 чалавек не хапае 35 рабочых.

Ня лепш стаіць справа і з рамонтам калёс, плугоў, вупражы і г. д. Яшчэ не адрамантавана 8 калёс. Плугі і вупраж былі раскіданы па хутарох. І толькі ў пачатку сакавіка прыступілі да збору і рамонту іх. Персанальна да кожнага каня вупраж не падагнана.

Мінэральнае ўгнаеньне ўжо каторы час ляжыць на станцыі. З атрыманых 80 тон прывезена толькі 40.

Зацьвердзілі плян яравых у 247 га. Намецілі цэлы рад аграмерапрыемстваў. Вызначылі і запісалі дабіцца вышэйшыя ўраджайнасьці з кожнага га: збожжавых—6 цэнтн., бульбы — 90, кораньплодаў—120 цэнтн.

Намецілі... Вызначылі... Запісалі... І больш нічога.

Так пасталі і запісвалі яшчэ ў мінулым годзе. А ўраджай ад намячэньняў і запісваньня — ня ўзьнімаў ся. У 1932 годзе атрымалі з га: аўса —1,3 цэнтн., ячменю—4 цэнтн., жыта—4 цэнтн., вікі—2,8 цэнтн. і бульбы—42,3 цэнтн.

Бязьдзейнасьць партячэйкі прывяла да зрыву падрыхтоўкі да сяўбы ў саўгасе.

Папкоў—былы сакратар ячэйкі КП(б)Б, замест апэрацыйнага кіраўніцтва гаспадаркай займаўся голым адміністраваньнем, падмяняў дырэктара, культываў сямейнасьць і патураў разлажэньню і іншым нездаровым зьявішчам, якія мелі месца ў ячэйцы.

Папкоў выкываў з саўгасу ўсіх, хто асьмельваўся крытыкаваць яго «работу». Камсамолка-ўдарніца **Лапато** была зьнята з работы старшыні рабачкому, а потым і з работы ў краме толькі таму, што ў Папкова з ёй былі асобныя рахункі.

Выконваючы некаторы час абавязкі дырэктара саўгасу, ён злоўжываў гэтым становішчам. Атрыманыя прам тавары Папкоў разьмяркоўваў сярод сваіх прыхлебацеляў. Ён-жа прэміяваў жонку высланага контр-рэвалюцыянэра, дачку кулака. Але гэтыя услугі буржуазнага перараджэнца Папкова да клясава-варожых элементаў не вытрымваюцца. Калі патрабаваліся гэтай самай Станкевіч боты, дык Папкоў і Міхалькоў павезьлі яе на саўгасных конях у Менск купляць боты, затраціўшы на гэта некалькі дзён.

Кантралёр саўгасу **Міхалькоў**—правая рука Папкова. Ён, як прадстаўнік дзяржаўнага кантролю, ня выконваў свайго простага абавязку. У адказ на здаровую крытыку непаладкаў у саўгасе, ён запалохваў рабочых, пагражаючы Салаўкамі і звальненьнямі з працы.

Міхалькоў займаўся шкодніцкай работай. Ён, пацяжыўшы зоатэхніка, загадваў конюху выпісваць коням муку замест аўса. Бяз ведама загадчыка фэрмы ён зьняў з работы сьвінарку **Казло.** Міхалькоў скасоўваў распараджэньні дырэктара. Зьнімаў рабочых з адпаведных вучасткаў работы і пасылаў на іншыя вучасткі. Міхалькоў, як і Папкоў, трымаў цесную сувязь з дачкой кулака Станкевіч, выкарыстоўваючы ня кватэру для сыстэматычнага п'янства. Дырэктар **Шырко,** як камуніст, праявіў гніла-ліберальныя адносіны да Папкова і Міхалькова. Ён ня выкрываў антыпартыйную дзейнасьць гэтых жулікаў з партыйнымі білетамі. Шырко не клапаціўся аб становішчы саўгасу.

Шкодніцка-дранежніцкія адносіны да каня прывялі да таго, што 64 проц. конскага пагалоўя выбываюць са строю. Конь у саўгасе абязьлічан. Напрыклад, коні «Грак» і «Маруся» за 1933 год перабылі ў руках рабочага Іордана—тыдзень, Бергера—дэкаду Бенэнсона—тры месяцы, Немца—тры месяцы і, урэшце, выйшлі са строю.

Другая пара: «Варэла» і «Жураўка» за год прабылі ў трох рабочых. І парэшце, членам КП(б)Б Лубяшковым у дарозе гэтыя коні прыведзены да пагібелі.

Кармоў зараз не хапае. А ў зімовы час яны разбазарваліся. За пяць месяцаў (кастрычнік-люты) коням выдана кармоў 637,1 цэнтн., канцэнтраваных—153,8 цэнтн. Гэта значыць, па 15 кілё на кожнага каня ў суткі.

Старшыня рабачкому **Грабеньнікаў** таксама стаў на шлях прымірэнцтва і замазваньня фактаў гнілі ў ячэйцы.

Вялікая віна падае і на новаабранага сакратара ячэйкі КП(б)Б тав. **Сомава.** Ён, а таксама і старшы рабочы Карачун, і інш. камуністы саўгаса су ўстойвалі гніль і сямейнасьць. Яны замест таго, каб арганізаваць масы рабочых на пасьпяховае правядзеньне падрыхтоўкі да сяўбы, займаліся «очковтирательством» і славесна-дэкляраціўнай балбатнёй. Менскі трэст «Сьвінавод» пра ўсё гэта ведаў, але мер не прымаў.

Партмасавая работа ў саўгасе адсутнічае. Аб гэтым гаворыць хоць-бы такі факт. Былая батрачка, зараз тра ктарыстка, Кульчанская (член ЛКСМБ) была прынята ў кандыдаты партыі. Прайшло 8 месяцаў і яе з партячэйкі выключылі за няўплату членскіх узносаў. А з камсамолу тав. Кульчанская ня выключана, бо яна зьяўляецца актыўным членам ЛКСМБ. Яе натружаюць работай, дапамагаюць і г. д. **Партячэйка з кандыдатамі ніякай работы не праводзіць.**

Менскі гарком КП(б)Б ужо ірыняў адпаведныя меры. Брыгада гаркому правяла глыбокае абсьледваньне работы ячэйкі КП(б)Б саўгасу Курганы. Усе махінацыі і дзейнасьць антыпартыйных элементаў Папкова, Міхалькова і інш. выкрыты. **Задача зараз заключаецца ў тым, каб умацаваць саўгас моцнымі, праверанымі партыйнымі, кадрамі,** каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

Вас. Стальноў.

Па-бальшавіцку змагацца за пралетарскі інтэрнацыяналізм

Ні сыгналам «Правды» пра скажэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі на Беларусі, ні адпаведным пастановам ЦК КП(б)Б у Аршанскім не надалі асаблівага значэньня. І толькі пасьля таго, як у раённым і цэнтральным друку зьявіліся заметкі, у якіх выкрываліся факты скажэньня нацыянальнай партыі ў Аршанскім раёне, толькі тады кіраўніцтва Аршанчыны заварушылася.

Перш за ўсё, людзі кінуліся шукаць «аспэўнага і канкрэтнага посьбіта зла» — раённую нацкамісію. І вось якраз па гэтым, у рэзультаце пошукаў нацкамісіі, надзвычай выразна праявілася тое, як кіруючыя раённыя работнікі Аршанчыны адносіліся да правядзеньня ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Нават спэцыяльна вылучаная камісія па праверцы фактаў, аб якіх сыгналізавалася ў друку, не змагла ўстанавіць існаваньня нацкамісіі. Хадзілі толькі чуткі (у сьпісах райкому, РВК і раённай рэдакцыі), што хаця нацкамісіі фактычна і ня было, але затое ёсьць Касьцюкевіч, які нібыта лічыцца старшынёй камісіі. А таму, калі бязьдзейнасьць нацкамісіі стала неабвержным фактам, па бюро райкому партыі 28-га сакавіка абылася паміж кіруючымі работнікамі раёну размова шыпёлпа такога зьместу:

Тав. ЧАРНЫШОЎ (сакратар РК): Ёсьць прапанова тав. Касьцюкевічу вынесьці вымову.

Тав. ВАЛАСЕВІЧ (старшыня РВК): Ён тут нічым. Ёсьць пастанова, згодна якой абавязкі старшыні нацкамісіі ўскладзены на тав. Забеліна.

ЧАРНЫШОЎ: У такім выпадку ёсьць прапанова паставіць на від тав. Валасевічу за тое, што ён на выканаў пастанову сакратарыяту РК аб рабоце нацкамісіі.

ВАЛАСЕВІЧ: Даю афіцыяльную даведку: такой пастановы сакратарыяту ніколі ня было.

ЧАРНЫШОЎ: У такім выпадку, трэба больш прапанаваць фракцыі РВК неадкладна скласьці нацкамісію.

Голас з месца: Дарэмна! Такую пастанову бюро райкому вынесла два тыдні таму назад.

ЧАРНЫШОЎ: Ну, калі такая пастанова ўжо ёсьць, то я выношу прапанову за яе невыкананьне паставіць тав. Валасевічу па від.

ВАЛАСЕВІЧ: Ну, вось тут-та я ўжо ўмін...

Мімаволі ўспамінаецца афарызм Максіма Горкага: «Сьмешнага ў гэтым багата, але вельмі мала вясёлага...»

Ітак, у Аршанскім раёне нацкамісіі ня было. І ня толькі нацкамісіі, ня было і бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму. Пра гэта зьрэзна сьведчаць факты. Праверка сыгналаў друку спэцыяльна вылучанай райкомам камісіяй паказала, што побач з клясава-варожымі вылазкамі на нацыянальна-культурным фронце, у Аршанскім мелі месца з боку паасобных камуністаў—адказных работнікаў — і некаторых ячэек яўна прыміранчыя адносіны да скажэньняў нацпалітыкі партыі і нават простае ігнараваньне дырэктыў ЦК па гэтым пытаньні.

Падамо некалькі прыкладаў. Намесьнікам дырэктара аршанскай канторы Энергазбыту **Маркіным** забаранялася работнікам канторы весьці службовую перапіску на беларускай мове. Калі-ж у сакратара партыйнай ячэйкі гэтай установы тав. **Кутчыка** запыталі, чаму не рэагуе на вялікадзяржаўніцкія вылазкі **Маркіна,** ён зусім спакойна адказаў:

— Я ня чытаю беларускіх газэт і таму аб гэтых вылазках нічога ня ведаю.

Пастаўніца Пагулляўскай ШКМ **Магер** адкрыта выступала супроць беларусізацыі, заяўляючы, што беларуская мова непрыдатна для таго, каб ёю карыстацца пры тлумачэньні навуковых формул і законаў, што гэта мова штучная, створаная шляхам мешаніны польскіх і рускіх слоў і што па Аршанчыне наогул гаварыць па нейкім сваласаблівым рускім дыялекце.

Пастаўлік літаратуры аршанскага рабфаку **Драздоў** адмаўляўся прымаць заявы, калі студэнт дрэнна ўладае беларускай мовай. Гэты вандэм у сваім артыкуле па вашпытаньні ні адным словам не заікнуўся аб барацьбе з рэшткамі нацыянал-дэмакратызму, заклікаў студэнтаў будаваць «агульналюдзкую» нацыянальную культуру. Артыкул быў зьмешчан у пасьцегазэце. Усе гэтыя факты партыйнай ячэйкай рабфаку былі ўстаноўлены, але... але паасобныя камуністы-настаўнікі (**Шэйніна**) раіл ячэйцы пакуль што «не гаварыць аб гэтым, бо, бачыце, яшчэ рана, трэба сабраць больш фактаў»...

Падобныя факты скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі ў практыцы работы раду школ сьведчаць аб тым, што ў Аршанчыне школам адлаецца мала ўвагі. Толькі гэтым можна пасьвятлумачыць тое, што сярод настаўнікаў Аршанскага раёну ёсьць нямала былых паліцэйскіх, белых афіцэраў, папоў і паповічаў, і асабліва густа—кулакоў. Прычым усе яны сканцэнтраваны ў фабрычна-заводзкіх сямігодках і школах калгаснай моладзі, дзе і праводзяць сваю «работу».

Як ня дзіўна, але факт, што для іх дзейнасьці Аршанскі раённа стварыў даволі сярыёзныя ўмовы. Каб пераканацца ў гэтым, даволі пазнаёміцца з інструктарскімі кадрамі раёна і іх працуцыйнай працы — «актамі праверкі работы школ». У гэтых актах вы можаце даведацца аб тым, колькі ў школе ёсьць дроў, у якім становішчы школьная прыбіральня і г. д., а вось аб зьмесьце работы школы, аб клясавым твары настаўнікаў у актах, як правіла, нічога няма. Інструктар **Іваноў** ставіць знак роўнасьці паміж паняцьцем «калгасьнік» і «кулак». А яго калега **Цэханскі** ідзе яшчэ далей. Напрыклад, у Ламачынскай школе працуе настаўніцай дачка папа — жонка дзяка **Шэрбава.** Яна на сваіх лекцыях расказвае вучням аб тым, што «ў калгасах жывуць толькі адзіначкі, а ў саўгасах батракі», што «працавіты адпасобнік заўсёды жыў добра, а гультаяваты ніколі нічога ня меў», што «зараз ужо ў калгасах няма кулакоў, бо іх усіх выслалі» і г. д. І вось, **Цэханскі** (па рэчы, сам клясава-чужога нам паходжаньня), якому давялося канстатаваць гэтыя факты, лічыць, што Шчэрбава «мала разумее сучасьць савецкай пасьпяховай школы», а таму і робіць такія «палітычныя скамялкі».

Ясна, што пры такіх інструктарскіх кадрах у раёне цяжка мець поўнае ўяўленьне аб тым, што робіцца ў школах, у якім духу выхоўваюцца дзеці.

Аб усіх гэтых фактах сыгналізавалася ў друку, і зараз, пасьля адпаведнай работы камісіі, гэтыя факты пацьвярджаны.

Аднак, ня лішнім будзе адзначыць, што праверачная камісія падышла да справы фармальна, надзвычай павярхоўна, у рэзультаце чаго яе праца пасіла па меншай меры адпабокі характар. Па-першае, камісія абмежавалася толькі тым, што праверыла пацьвярджаньасьць фактаў, аб якіх сыгналізавалася на старонках цэнтральнага і раённага друку.

Камісія прайшла мімо абураючых фактаў скажэньня ленінскай нацпалітыкі. Мінулай восенью, выконваючы пастанову бюро РК КП(б)Б Аршанскі раённа адкрыў арыгінальнай школе-прымітыўцы (яўрэйскай) пятую групу. За адкрыцьцё пятай групы пры гэтай школе некаторыя таварышы аз фракцыі РВК атрымалі спагнаньне. За што? Былы старшыня Аршанскай РКК **Хаскін** абвінавачваў іх у тым, што яны працяць дзяржаўныя сродкі на выхаваньне смаланскіх... спэкулянтаў і гандляроў.

Такім чынам, адны кіруючыя работнікі раёну азначаюць клясавую прыналежнасьць дзяцей па нацыянальных алэнаках, адкрыта выступаюць супроць выразных указаньняў партыі аб культурна-асьветным абслугоўваньні і работе сярод нацменшасьцяй, а другія робяць вытлум, што не заўважаюць гэтага, прапускаюць гэта міма вушэй.

Яшчэ больш грубай памылкай у рабоце праверачнай камісіі зьяўляецца тое, што яна пытаньні нацыянальна-культурнага будаўніцтва па сутнасьці зьвяла толькі да пытаньняў мовы, стрычым амаль усю сваю ўвагу сканцэнтравала на рабоце навучальных і культурна-асьветных устаноў. Толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што з-пад увагі камісіі выпалі такія пытаньні, як барацьба з рэшткамі нацыяналізму на гаспадарчым фронце, пытаньні інтэрнацыянальна-клясавага выхаваньня на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах. У радзе інтэрнацыянальных калгасаў раёну («Парфёнаўка», «Жалезьнякі» і інш.) над шыльдай самаачысткі калгасаў ад шкодных элемэнтаў кулакі нацкоўваюць «пляхту» на «мужыкоў».

У мінулым годзе ў калгасе «Зьвязда» быў старшынёй кулак і актыўны дзеяч нацкомаўскага «краязнаўства» **Марчанка.** Пад кіраўніцтвам гэтага нацдэма ў калгасе гнаілі прадукты, заворвалі поле так, каб не закрануць «самабытных» межаў. Калгаснікі выкрылі шкодніцкія ўчынкі нацдэма Марчанкі і выгналі яго са сваіх радоў. Але-ж ні мясцовая партыйная ячэйка, ні раённыя кіруючыя арганізацыі не ўсьвялі гэтага факту на прынцыповую вышыню. Больш таго, аб ім забыліся, і зараз Марчанка працуе ў тым-жа калгасе настаўнікам.

Значная засьмечанасьць выхаваннямі выкомага на Аршанчыне прымушае Кіраўніцтва мае месца ў аршанскім райземаддзеле (Ражкоў, Ахрамовіч і інш.). Гэтыя людзі, якія, да рэчы, паходзяць з клясава-чужога асяродзьдзя, адыгралі немалую ролю ў тым, што па Аршанскім раёне летась меў месца пагасеў яравых культур на 17 проц. і па радзе сельсаветаў азімых на 30-40 проц.

На ўсё гэта не зьвярнула ўвагі праверачная камісія. І ня толькі камісія. Раённае кіраўніцтва таксама не праявіла належнай пільнасьці ў адносінах да рэшткаў контр-рэвалюцыйнай прымнжаўшчыны, не праявіла патрэбнай рашучасьці ў зьнішчэньні яе карэньняў.

Пасьля абгаварэньня вынікаў работы праверачнай камісіі, бюро РК КП(б)Б за страту клясавай пільнасьці, за недапушчальную бязьдзейнасьць якая на сумнасьці прыкрывала клясава-варожыя вылазкі вялікадзяржаўнікаў, нацдэмаў і іншых шкадыстаў, зняло з пасту культсэкта РК Шарыцу і загадчыка райана Забеліна і вынесла ім, а таксама раду іншых раённых і гарадзкіх работнікаў суровыя партыйныя спагнаньні.

Аднак, ясна, што гэта пастанова бюро яшчэ не забясьпечвае разгорнутай бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму ва ўсіх вызначных аршанскай парторганізацыі. Задача раённага кіраўніцтва арганізаваць больш глыбокую праверку, як незавыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі забясьпечваюць разгортваньне работы па інтэрнацыянальна-клясавым выхаваньні мас, мабілізуючы іх на бязьлітасную барацьбу супроць усякіх праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму, супроць буржуазна-кулацкіх, нацыяналістычных элементаў, якія прыкрываюць сваю дзейнасьць фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Кіраўніцтва Аршанчыны павінна пакончыць з дэкларацыйнасьцю, саноўна-панскімі адносінамі да правядзеньня ў жыцьцё нацыянальнай палітыкі партыі. Ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі немагчыма без упартай штодзённай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам — тэнуўнай небясьпекай на даным этапе — і з актывізуючымся нацыянал-дэмакратызмам, які ва ўмовах Беларусі набывае асаблівую надзённасьць. Гэтага ні ў якім разе не павінна забываць асабліва кіраўніцтва Аршанчыны.

Віт. Даль.

ВЫТРЫМАЦЬ БАЯВЫ ЭКЗАМЕН

Калгагаворная кампанія зьяўляецца моцным вагарам у справе мабілізацыі мас на барацьбу за выкананьне прамфінпляну, у першую чаргу—на барацьбу за выкананьне якасных паказальнікаў, на павышэньне прадукцыйнасьці працы.

Аднак, трэба сказаць, што працэсы нацыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі заводу імя Варашылава да гэтага часу не аддавалі гэтай справе належнай увагі. Гэта высьветлілася ў першую чаргу па запазыцы перагляду яўна зьніжаных норм. Гэта высьвятляецца і ў тым, што прамфінплян першага кварталу, першага году другой пяцігодкі выканан за студзень на 82 проц., і з 1-га лютага па 20 сакавіка толькі на 44,6 проц.

Ня гледзячы на тое, што пераразключэньне калгагаворaў ператварылася ў масавую кампанію, у праверцы выкананьня старога калгагавору прымала ўдзел толькі 400 рабочых. На заводзе было арганізавана каля 53 самаправераючых брыгад. Аднак, грамадзкія арганізацыі заводу, у асаблівасьці заўком, недаацанілі важнасьці вялікага палітычнага значэньня гэтай кампаніі.

Пры праверцы брыгады выявілі ў старым калгагаворы невыкананых 19 пунктаў, якія не выконваліся як заўкомам, так і заводакіраўніцтвам. Рабочыя ўнесьлі рад канцэтных прапаноў, як брыгады рамонтна-будаўнічага цэху, сьлясарна-зборачнага і інш. Усё-ж увага брыгад і ўсёй рабочай масы ня была выстарчальна мабілізавана заводзкім камітэтам.

На працягу ўсяго часу ходу калгагаворнай кампаніі пытаньне аб перагляде яўна зьніжаных норм было самым закінутым вучасткам. Заўком і ўвесь прафактыў заводу спачатку вельмі слаба ўзяліся за гэту палітычна-гаспадарчую справу, зусім забываючы, што гэта зьяўляецца цэнтральным месцам у барацьбе за выкананьне пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Толькі за апошнія дні бюро партканкрэтнаму па-баявому разгарнула масавую работу па перагляду яўна зьніжаных норм.

Увесь ход работы па старонках газэты, з нумару ў нумар зьмяшчаецца канкрэтны апэрацыйны матар'ял на перазаключэньні калгагавору. Па заводу да перагляду выпачана 1.081 норма, прычым амаль на кожным абгаворнае працуючы высьвятляецца зьніжэньня іх зьніжанасьць, што ў значнай меры падаражала сабекошт і ставала пагрозу на ліквідацыю прадукцыйнасьці працы.

Гэта выклікала новы ўзьлём актыўнасьці, новую хвалю спаборніцтва. Рабочыя кацельнага цэху да перагляду пазацілі 417 норм, нормы часу—7.838. Расцэнак быў 6.076. Пасьля перагляду запьвердзілі на РКК наступныя лічбы: 417 норм, норма часу—5.141, расцэнак—3.834. Такім чынам атрымалі эканомію 2.697 гадзін і расцэнак даў эканомію ў прошах — 2.241 руб.

Рабочыя сьлясарна-зборачнага цэху, заўважыўшы пры праверцы рад яўна заніжаных норм і заявілі добраахвотна аб павышэньні норм па такарнаму варштату на 20 проц.

На парадзе цэхавага актыву сумесна з ТНВ выявілася, што норму можна павысіць ня толькі на 20 проц., але да 27. На гэта рабочыя бяз спрэчак давалі сваю згоду.

Рабочыя малярнага цэху заявілі аб добраахвотным павышэньні норм на 10 проц. Брыгада Крыена дала сустрэчны плян павышэньня норм па 5 проц. Іх прыкладу сьледуюць адзін за адным астатнія цэхі і брыгады, як ліцейны і інш., якія адначасова настойваюць на хутчэйшым перагляде норм.

Рабочыя брыгады па перагляду калгагавору працуюць сваю работу па цэхах. За час калгагаворнай кампаніі з цэхаў ад рабочых паступіла 74 прапановы, з іх 36 вытворчага характару, па тэхніцы бясьпекі—5, сан бытавых—27 і па нормаваньні—6.

Рабочыя па цэхах узялі на сабе наступныя абавязкі: выканаць прамфінплян на 100 проц., зьнізіць брак да нуля, ліквідаваць прагулы, зьнізіць прастой, палепшыць якасьць прадукцыі, павысіць прадукцыйнасьць працы, стопрацантны ўдзел рабочых у абмеркаваньні калгагавору.

Паміж цэхамі разгорнута сацыяльнае спаборніцтва. Ліцейны цэх выклікаў сьлясарны, зборачны, такарны і інш. цэхі.

Усё гэта з асаблівай яскравасьцю паказвае, што толькі правільна арганізаваная масава-растлумачальная работа, толькі бальшавіцкае ўмелае кіраўніцтва масамі зьяўляецца зарукай правядзеньня ў жыцьцё мерапрыемстваў і пастаноў партыі па выкананьні вялізарнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэтага мы не павінны забываць у часе практычнага ажыцьцяўленьня асноўных пунктаў новага калгагавору. Бязумоўна расьце лік ударнікаў. Дзень за днём павялічваецца магутная армія герояў-барацьбітоў.

Калгагаворная кампанія—экзамен для нашых прафарганізацый, праверка іх баяздольнасьці ў барацьбе за выкананьне пляну першага году другой пяцігодкі. Экзамен гэты павінен быць вытрыманы!

Д. Хмель.

Калдагаворная на менскай абутковай фабрыцы

На менскай абутковай фабрыцы кампанія па праверцы і пераразключэньні калдагавору пачалася ў першых лічбах сакавіка. Па ўсіх цэхах былі створаны часовыя кантрольныя камісіі, пад кіраўніцтвам якіх працавала 60 самаправераючых брыгад. У самаправераючых брыгадах прымала ўдзел 389 рабочых.

Але, правёўшы значную падрыхтоўчую работу, фабком у часе праверкі выкананьня старога калдагавору невыстарчальна кіраваў работай як агульна-фабрычнай часовай кантрольнай камісіі, так і цэхавых, якія ў выніку гэтага працавалі слаба. Гэта адбілася на выніках работы самаправераючых брыгад. Па цэхах ня былі праведзены падагульваючыя сходы. У новы калдагавор паступіла толькі 39 прапаноў, в якіх 9 рацыяналізатарскіх.

Вельмі слабы ўдзел у правядзеньні калдагаворнай кампаніі прымаў агульна-фабрычны друк. Фабрычная шматтыражка толькі з 20 сакавіка разгарнула паказ ходу кампаніі на сваіх старонках.

20 сакавіка фабрычны камітэт за бязьдзейнасьць распусьціў агульна-фабрычную часовую кантрольную камісію, і ўзяўся за ліквідацыю недахопаў. Фабрыка выклікала на сацыяльнае спаборніцтва па лепшым правядзеньні калдагаворнай кампаніі фабрыку «Усход».

Зараз на абутковай фабрыцы ідзе перагляд норм і расцэнак. Ужо пераглежаны нормы па штамповальным машынным і пазэйным цэхах. За гэты час вылучена 34 яўна зьніжаных норм. Перагледжаны нормы, фабрыка атрымае 21.975 руб. эканоміі.

Перагляд норм выклікаў творчы ўздым сярод раб

Аб праяўленьні яўрэйскага буржуазнага нацыяналізму і працягваньні бундаўска-нацдэмаўскай кантрабанды ў работах Чарняўскага і інш.

Пастанова сакратарыяту Менскага гаркому КП(б)Б і прэзыдыуму МенгарКК

1. На фоне актыўізацыі клясава-варожых элементаў у краіне, што зьяўляецца адбіткам супраціўленьня рэшткі контр-рэвалюцыйных элементаў разгорнутаму фронту сацыялістычнага будаўніцтва, актывізуюцца яўрэйскія шавіністычныя нацдэмаўскія і бундаўскія элементы.

Перамогі партыі на фронце будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу, рост эканамічнага і культурнага разьвіцьця яўрэйскіх рабочых і працоўных мас у СССР і БССР, пасьпяховая барацьба партыі з рэшткамі аджылых клясаў рэчы прыгнечаных нацый, у тым ліку і яўрэйскай, з яўрэйскім буржуазным нацыяналізмам, ідэалізацыяй Бунду, клерыкалізму і правапартыністычнай прыцчэпаўскай практыкай у эканоміцы, — выкліканюць шалёнае супраціўленьне клясава-варожых элементаў, культывуючых буржуазны нацыяналізм, пад прыкрыцьцём фальшываінтэрнацыянальнага сьцягу асабліваючых адзінства працоўных народаў СССР і граючых на руку Інтэрэсантам.

2. Сакратарыят ГК і прэзыдыум гарКК канстатуюць, што за апошні час мае месца рад фактаў, якія сьведчаць аб актывізацыі яўрэйскага буржуазнага нацыяналізму і бундаўска-меншавіцкай кантрабанды. Гэта асабліва праявілася ў тэарэтычнай рабоце раду работнікаў яўсэктару Акадэміі Навук Беларусі.

Адным з яркіх праяўленьняў яўрэйскай буржуазна-нацыянальнай і бундаўскай кантрабанды ў тэарэтычнай літаратуры на яўрэйскай мове зьяўляюцца работы Чарняўскага, зьмешчаныя ў зборніках яўсэктару АНБ.

3. Лічыць устаноўленым, што ў радзе сваіх работ у галіне гісторыі яўрэйскага рабочага руху Чарняўскі сыстэматычна праводзіў буржуазна-нацыяналістычныя погляды і практыкаваў бундаўска-меншавіцкую кантрабанду. У сваёй рабоце «Кастрычніцкая рэвалюцыя і разлажэньне яўрэйскіх дробна-буржуазных партый» Чарняўскі цьвердзіць аб рэвалюцыйнасьці яўрэйскай буржуазіі («Кожны выбух рэвалюцыі ў Расіі абуджаў поўныя надзеі ва ўсіх чкатках яўрэйскай буржуазіі»), ён цьвердзіць, што яўрэйская буржуазія— «буржуазія нацыі, пазбаўленай тэрыторыі, і для яе, зрозумела, няма поўных гарантый для сьвецкага жыцьця ў Расіі». Чарняўскі зводзе клясавую сутнасьць яўрэйскай буржуазіі і, такім чынам, прапагандуе адзінства яўрэйскай нацыі. Чарняўскі імкнецца даказаць рэвалюцыйны характар Бунду і змазаць контр-рэвалюцыйную сутнасьць і дзейнасьць гэтай партыі, а таксама і сіяністаў.

4. У сваім артыкуле «Да пытаньня аб эканамізьме» ў яўрэйскім рабочым руху Чарняўскі становіцца на шлях апалёгетыкі меншавізму-бундызму. У гэтым артыкуле меншавік - бундавец Гінзбург, асуджаны па працэсу меншавікоў, фігуруе ў якасьці «піянэра рабочага руху». Гэты артыкул цалкам пабудаваны на сьведчаньнях меншавіцкіх і бундаўскіх пасьледыроў (Гінзбург, Мадэм, Мартаў, Гурэвіч, Міхалевіч і інш.), прычым Чарняўскі, цытуючы гэтых зьлепых ворагаў пралетарыяту, замест крытыкі іх, будуе свае меркаваньні на іх сьведчаньнях. У радзе іншых месц Чарняўскі шляхам кантрабанды папулярызаваў рэнэгата-шкодніка Раснава і нацдэма Сосіна.

5. Такім чынам, Чарняўскі, пад прыкрыцьцём фальшыва - нацыянальнага сьцягу, у форме быццам-бы супроць яўрэйскага буржуазнага нацыяналізму, працягваў буржуазна-нацыяналістычныя погляды на гісторыю яўрэйскага рабочага руху, устанавіўшы такім чынам адзіную лінію з ідэолёгамі сацыял-фашысцкага Бунду за граніцай.

Канстатаваць, што ў сваім лісьце ў рэдакцыю газэты «Аншлёр» і ў сваім выступленьні на сакратарыяце ГК Чарняўскі ўпарта адстойвае свае ўстаноўкі.

6. Аналёгічныя ўстаноўкі яўрэйскага нацыянальнага дэмакратызму і бундызму маюць месца ў радзе іншых работ, зьмешчаных у зборніках яўрэйскага сэктару АНБ.

У сваёй рабоце Аляксандраў імкнецца даказаць, што партыя не ажыцьцяўляе сваіх задач па прыцягненьні яўрэйскіх рабочых у буйную прамысловасьць, і працягвае нацдэмаўскі погляд на прапарцыянальнае прадстаўніцтва рабочых розных нацыянальнасьцей у галіне прамысловасьці. Х. Гельмштох у сваёй рабоце па пытаньні лінгвістыкі працягвае ідэышыцка-нацдэмаўскія погляды на яўрэйскую мову, адмаўляючы клясавую барацьбу ў галіне мовы. Аналёгічныя ўстаноўкі маюць месца ў рабоце па гісторыяграфіі Гельмштока і Рубіна.

Усё гэта гаворыць аб тым, што з боку рэдакцый і партрэпрулы яўрэйскага сэктару АНБ ня толькі ня было праведзена бальшавіцкай ваяўнічасьці супроць яўрэйскага буржуазнага нацыяналізму, а быў праведзен, яркім чынам, гніёлы лібералізм і прымірэнцтва да клясава-варожых выпадзак, што з боку камуністаў — работнікаў яўсэктару АНБ праведзена прыпушчэньне клясавай пільнасьці.

Партарганізацыя АНБ несвоечасова рэагавала і не паставіла на ўсёй шырыні ўсіх пытаньняў, зьвязаных з клясава-варожымі выпадкамі ў выданьнях яўсэктару АНБ.

Выходзячы з гэтага, сакратарыят ГК і прэзыдыум гарКК пастанаўляюць:

1. Чарняўскага, у мінулым бундаўца і былога афіцэра, які два разы выключаўся з партыі, — як бундаўска-нацдэмаўскага кантрабандыста з партыі выключыць.

2. Пытаньне аб гніёла-лібэральных адносінах камуністаў-рэдактароў зборнікаў да бундаўска-нацдэмаўскіх выпадак і аслабленьні клясавай пільнасьці з боку кіраўніцтва партколектыву АНБ да пасобных камуністаў — перадаць на разгляд гарКК.

3. Урокі клясава-варожых выпадак у яўсэктары АНБ зьяўляюцца адным з паказальнікаў аслабленьня інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы ўсіх грамадзкіх арганізацый сярод яўрэйскіх рабочых і працоўных, работы па мабілізацыі іх на барацьбу з ухілам ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць яўрэйскага шавінізму і ідэалізацыі яўрэйскіх контр - рэвалюцыйных дробна-буржуазных партый.

Сакратарыят ГК і прэзыдыум гарКК звяртаюць увагу ўсёй партарганізацыі на тое, што выпадкі Чарняўскага і другіх не зьяўляюцца адзінымі, што гэта ёсьць толькі адна з форм праяўленьня актывізацыі яўрэйскага буржуазнага нацыяналізму, які мае свой адбітак у цэлым радзе інш. галін работы (культурныя і навучальныя ўстановы, калгасы, літэратура і інш.), які імкнецца праз адсталую частку яўрэйскіх рабочых просякнуць і не прапрэтыкуе. Гэта вымагае ад партарганізацыі разгорнутай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні мас, вымагае рашучай барацьбы з усялякімі праяўленьнямі яўрэйскага нацыяналізму, з прымірэнцтвам і гніёла-лібэральнымі адносінамі да яго, вядучы барацьбу на два фронты, жорстка расправяўляючыся з агентурай буржуазнага нацыяналізму ў радах партыі.

Даручыць рэдакцыям газэт і часопісяў, усім партколектывам разгарнуць шырокую крытыку бундаўска-нацдэмаўскай кантрабанды ў работах Чарняўскага і інш., мабілізуючы рабочых і працоўных на барацьбу за практычнае праведзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі супроць клясава-варожых выпадак.

Паставіць пытаньне перад рэдакцыяй «Аншлёра» аб неабходнасьці разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод яўрэйскіх рабочых і працоўных у сувязі з актывізацыяй яўрэйскага нацыянал-дэмакратызму і бундаўскай кантрабанды.

НА АДНЫМ І ТЫМ-ЖА МЕСЦЫ

25 лютага скончыўся тэрмін, увага ноўлены ўрадам БССР для выкананьня пляну загатовак насеньня гародных і травяных культур. Калдарацыйная сыстэма, якая вялася ад нас у асноўных загатоўшчыкаў, прывяла да таго часу з вусім недазвальняючымі рэзультатамі. Заданьне на было выкананым нават напалову.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР зрабілі суровае папярэджаньне Беллюдагародніне. Перад гэтай арганізацыяй была пастаўлена баявая задача—дабіцца рашучага пералому на працягу бліжэйшых-жа дзён. З таго часу прайшло больш месяца, але становішча амаль не зьмянілася. Плян і на 25 сакавіка ня выкананым ні па адной культуры, за выключэньнем некаторых гародных культур. Па рэду важнейшых гародных культур адставаньне праявілае заставацца даволі значным. Так, насеньня сталовай моркавы загатоўлена 48 проц. заданьня, часнаку — 5 проц. Па гароху плян выкананым толькі на 40 проц.

Асабліва пагражаючае становішча па вучастку культурных траў. Канюшины—гэтай рашаючай культуры—павінна быць загатоўлена 66.500 клгр., загатоўлена-ж усяго толькі 19 проц. гэтай колькасьці; насеньня лубіну ёсьць 32 проц., сэрадэлы — 43 проц., цімафееўкі — 36 проц.

Прывезеныя лічбы—яркае адлюстраваньне злачынкага адпіраваньня загатовак насеньня з боку многіх раённых арганізацый і, у першую чаргу, райсаюзаў. Вялізарнае палітычна-гаспадарчае значэньне свалачкоўай мабілізацыі насеньня ўнутры БССР яўна недаацэньваецца на месцах, а часамі поўная бязьдзейнасьць у галіне загатовак насеньня зьяўляецца па простым розьультатам упрыманых настрояў: «Нічога, ня хопіць насеньня, заявяць з Украіны, ці з іншых раёнаў Саюзу».

Палітычная недаацэнка загатовак і стаўка на завоз насеньня ззнову БССР адсунула мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў на задні плян. Пры правядзеньні збожжа і цьнзагатовак аб насеньні нават не думалі, прыцьмяючыся тэорыі чарговасьці кампаній. Раёны сталі займацца гэтай справай толькі ў самы апошні час, і то толькі «паміж іншым».

Ва многіх месцах пляны спакойна адлежваюцца ў сельсаветах сталох. Сельсаветы не далі цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным дваром, ня ўжылі ніякіх мер, каб дабіцца выкананьня пляну калгасамі, калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі.

Адсутнасьць належнай арганізацыі загатовак насеньня і ўвагі да гэтай справы з боку раённых партыйных і савецкіх арганізацый выкарыстоўвае клясавы вораг у вёсцы. Кулак добра ўлічыў становішча і, шляхам арганізацыі сабатажу выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай па зданы насеньня, працуе сарваць весняную сяўбу. Імкненьні клясавага ворага, накіраваны на галоўны і важнейшы для жыцьцядзейнасьці Беларусі вучастак—на вучастак мабілізацыі насеньня культурных траў.

Вопыт збожжазагатоўчай кампаніі, а таксама ільназагатовак, як паказвае практыка, пакуль не навучыў многіх раённых арганізацый БССР. Кулак кажу сабатажу ня пан рэпучы адпор. Но вяцца рашучай барацьбы і з агентамі клясавага ворага, засеўшымі ў сельсаветах, калгасах, а часам і раёнах. Кулака і яго дапаможнікаў з пярэдзетамі ў кішэнях, зрываючых загатоўку насеньня, а тэтым самым і весняную сяўбу, пакуль не прымяняюць.

Каб ня быць галаслоўнымі, даволі прывесьці прыклады з практыкі галоўных раёнаў Беларусі. Менскі раён павінен даць 8 тыс. кілё насеньня канюшины, загатоўлена-ж усяго толькі 18 проц. Віцебскі раён павінен быў загатовіць 5 тыс. кілё, а загатовіў толькі 1 проц. гэтай колькасьці. Аршанскі раён выканаў плян па канюшыне на 40 проц., Асіпавіцкі—на 24 проц., Барысаўскі — на 7 проц., Бягомльскі—на 18 проц., Бярэзінскі—на 8 проц. і г. д. Ці прыняты якія-небудзь рэпрэсіі супроць саботажнікаў загатовак у пералічаных раёнах? За адзінкавымі выключэньнямі, ня прыняты. Ці разгорнуты масавая работа вакол загатовак насеньня, ці аддаюць раённыя партыйныя арганізацыі гэтай задачы патрэбную ўвагу? Не.

Усё выпадкзазанае ў апошнюю большай ступені адносіцца да загатоўчай сыстэмы калгарацыі. Факт зусім бясспрэчны, што райсаюзы, сельспажыўтаварыствы і Беллюдагародніна, якая ўзначальвае загатовіі, да гэтага часу па-бальшавіцку не разгарнулі даручанай ім работы.

Што робіць сельспажыўтаварыства? Яно чакае пакуль работу распачне сельсавет, калі мясцовыя органы ўлады і партыйная ячэйка забясьпечаць посьпех арганізацыйна. Там-жа, дзе сельсавет і ячэйка ўжо зрабілі гэта, сельспажыўтаварыства... чакае зіатчыкаў насеньня ў сваіх крамах. Сельскія спажывецкія таварыствы, як правіла, абмяжоўваюць свае задачы чыста тэхнічнымі абавязкамі прыём насеньня і выдача квіткоў), не вядуць арганізацыйнай і масавай работы. Між тым, сельспажыўтаварыства, цесна зьвязанае з калгасам, калгасьнікам і аднаасобнікам, пры жаданьні можа арганізаваць ініцыятыву і актыўнасьць, зрабіць ня менш (а часам і больш), чым сельсавет.

Што робіць райсаюз? Сказанае аб сельспажыўтаварыстве ў пэўнай ступені адносіцца і да яго. Райсаюз чакае, пакуль за справу возьмуцца раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі, лічачы за лепшае прыйсьці на гатовае.

Прынятыя Беллюдагароднінай меры, не забясьпечваюць посьпеху загатовак. Яны хутчэй зьяўляюцца самастрахоўкай, чым адзінкай сапраўды ўзрастаючай актыўнасьці і перакіраваньня на апэрацыйнае кіраўніцтва загатоўкамі насеньня.

Становішча патрабуе прыняцьця цэнтральнымі кіруючымі органамі БССР тэрміновых і рашучых мер.

В. Л.

ТВАРАМ ДА КАЛГАСЬНІКА-УДАРНІКА

СЛУЦАК. Спажывецкая сыстэма Случчыны разгарнула вялікую работу па абслугоўваньні весняной пасеўнай кампаніі.

Атрыманыя першыя посьпехі — наглядны доказ таго, што райсаюз і спажыўтаварыствы сталі на правільны шлях.

Гандлёвы аддзел Случчанага райсаюзу падрыхтоўку да сяўбы пачаў перш за ўсё з карэннай зьмены мэтадаў работы. Спажыўтаварыствы і калгасы тавараі пастаўлена ім у простую залежнасьць ад выкананьня калгасамі, якія абслугоўваюцца тым ці іншым сельспажыўтаварыствам, сваіх вытворчых плянаў. Больш тавараў і лепшага асартымэнту атрымліваюць спажывецкія таварыствы таго сельсавету, дзе калгасы лепш падрыхтаваны да сяўбы. Тавараснабжэньне па прынцыпу насельніцтва ліквідавана, як не адпавядаючае задачам высокай кампаніі.

Ня лічачы клінавых тавараў (на рэчы, якіх не атрыманых), Случкі райсаюз выканаў для снабжэньня вёскі на бліжэйшы перыяд часу па-за клінавых прамтавараў на 100.000 руб. Спецыяльны фонд у 25.000 руб. прызначан для пэрсанальнага прэміраваньня лепшых ударнікаў-калгасьнікаў.

Гэтыя фонды складаюцца з вельмі ходкіх тавараў: абутку, гатовай вопраткі, мануфактуры, трыкатажу, бляшаных вырабаў і г. д.

Як разьмяркоўваюцца тавары паміж сельспажыўтаварыствамі? Вось яркі прыклад. Бокшыцкае і Лучнікоўскае сельспажыўтаварыствы, якія абслугоўваюць менш насельніцтва, чым іншыя, атрымалі прамтавараў на 50-100 проц. больш. Калгасы Бокшыцкага і Лучнікоўскага сельсаветаў карыстаюцца пераважным снабжэньнем таму, што яны зьяўляюцца пэрадавікамі ў раёне па падрыхтоўцы да сяўбы.

Такой-жа лініі дыфэрэнцыяванага снабжэньня прытрымліваюцца сельскія спажыўтаварыствы пры размеркаваньні тавараў паміж калгаснымі крамамі, сетка якіх да 1 сакавіка пашырэецца на 11 адзінак. Такім чынам, з красавіка ў Случкім раёне будзе працаваць **105 калгасных крам.** Новыя крамы адкрываюцца ў калгасах, якія своячасова выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай і добра рыхтуюцца да сяўбы. Ужо адкрыты крамы ў калгасах «Невязкі» (Ленінскае ОСТ), «Новы быт» (Першамайскае), «Ануфрыевічы» (Грэскае) і «Няжыўка» (Вялікі-Сьлёпскае ССТ).

Летась у раёне налічвалася 35 развозных пунктаў, прыкладна, па пацтары на сельсавет. Сёлета ў кожным сельсавеце арганізуецца ня менш 3-4 развозак. Ленінскае і Палікарпаўскае сельспажыўтаварыствы ўжо дагаварыліся з калгасамі аб выдзяленьні ім транспартных сродкаў для развознага гандлю. Развозкі будуць прадаваць калгасьнікам непасрэдна ў полі тытун, запалкі, цукерні, мінэральныя воды і інш.

Сельспажыўтаварыствы адпускаюць калгасным крамам тавары ў залежнасьці ад выкананьня вытворчага пляну тымі калгасамі, якія крама абслугоўвае. Ужываньне гэтага прынцыпу на практыцы не сустракае асаблівых затрудненьняў. Значна больш складанае пытаньне з пераважным снабжэньнем лепшых калгасьнікаў-ударнікаў непасрэдна ў калгасе. Каго і як павінна снабжаць калгасная крама і развозка? Як пазбавіць усялякага снабжэньня лодыра і гультая? Як забясьпечыць пераважнае снабжэньне ударнікаў?

У Случкім раёне за правільнае разьмеркаваньне тавараў адказнае камітэт упаўнаважаны калгаснай брыгады. Ён павінен весьці ўлік якасьці работы кожнага калгасьніка і разам са старшым брыгадзірам сыстэматычна даваць краме і развозцы патрэбныя весткі. Крама, апрача таго, пры водпуску тавараў улічвае запісы ў працоўнай кніжцы калгасьнікаў.

Шмат увагі аддалі спажыўтаварыствы поўнаму забесьпячэньню патрэб пасеўнай кампаніі ў дапаможных матар'ялах. Заключаны дагаворы з мясцовымі прамысловымі арцелямі на выраб коламазі і дзёгцю, патроба ў якіх будзе пакрыта поўнасьцю. Ва ўсе сельспажыўтаварыствы завезены рымарныя вырабы. Райсаюз мае патрэбнае абсталяваньне для арганізацыі новых 15 сталовак у калгасах. На спэцыяльных курсах падрыхтавана 8 кухараў.

Цікавы вопыт арганізацыйна-масавай работы разгорнут спажыўкаапэрацыяй з калгаснымі брыгадамі. Замест ранейшых доўгатэрміновых дагавораў, якія ахапілі рад пытаньняў, зараз заключаюцца кароткатэрміновыя вусныя дагаворы (асобна аб зборы насеньня, аб пратручваньні пасеўных матар'ялаў і г. д.). Гэта дае магчымасьць брыгадзе хутка адчуць на справе матар'яльнае стымуляваньне за выкананьне дагавору.

Дагаворы прадугледжваюць і канкрэтную дапамогу з боку каапактыву брыгадам. Рад фактаў сьведчыць аб значэньні гэтай дапамогі. Ведаючы пра недахват насеньня некаторых куль тур у частны калгасаў, каапактыў заняўся выяўленьнем лішкаў пасеўнага матар'ялу і выступіў пасрэдникам абмену паміж калгасамі. Пры дапамозе каапактыву калгасы «Пражэктар» і «Камбайн» абмяняліся насеньнем жыта і аўса.

Для працпаўкі цыроктыў пра перабудову работы сельспажыўтаварыстваў адбыліся куставыя нарады каапэрацыйных работнікаў, у якіх прымалі ўдзел крамныя камісіі, каапбюро, каапупаўнаважаныя брыгад, праўленьні калгасаў і брыгадзіры.

Зараз ва ўсіх сельсаветах праходзяць супольныя нарады сельспажыўтаварыстваў з калгаснымі брыгадамі, на якіх прапрацоўваюцца вытворчыя пляны брыгад і абгаворваюцца пытаньні аб пераважным снабжэньні ўдарнікаў. На 7 сельсаветах гэта работа ўжо праведзена.

Вопыт Случкай спажыўкаапэрацыі па падрыхтоўцы да сяўбы заслугоўвае шырокай папулярызацыі.

Ф. Л.

ПОУНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ У ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗАКУПКАХ ЗБОЖЖА! МАЦНЕЙ БАРАЦЬБУ З КУЛАКОМ, СПЭКУЛЯНТАМ І ПЕРАКУПШЧЫКАМ!

4 красавіка

Да гэтага часу яшчэ няма належнага пералому ў ходзе дзяржаўных закупак збожжа. Працца, за апошнюю пяцідзёўку сакавіка тэмпы закупак у параўнаньні з мінулымі пяцідзёўкамі прыкметна павялічыліся (за гэтым пяць дзён закуплена каля 1.200 тон збожжа), але ўсё яшчэ незадавальняюча, паколькі яны не забясьпечваюць ліквідацыі вялікага прарыву, які стварыўся за люты і сакавік. Зусім ясна, што гэтыя тэмпы трэба яшчэ больш павялічыць, дабіцца таго, каб кожная пяцідзёўка давала ня менш 6-7 тысяч тон збожжа.

Між тым у значнай частцы раёнаў няма і намёку на павялічэньне тэмпаў закупак. Даволі ўказаць на **Старобінскі** раён, дзе плян выкананы усяго на... 0,9 проц., **Гарадоцкі** — 0,6 проц., **Дрысенскі** — 0,10 проц., **Сенненскі** — 0,5 проц., **Шклоўскі** — 14 проц., **Прапойскі** — 1,6 проц., **Мсціслаўскі** — 1,6 проц., **Жыткавіцкі** — 1,4 проц. і інш. Па **Расонскім** і **Сіроцінскім** раёнах да гэтага часу не закуплена ні аднаго кілётраму збожжа.

Гэтыя раёны яўна недаацэньваюць вялікага значэньня дзяржаўных збожжазакупак, не змагаюцца па-бальшавіцку за поўнае выкананьне плану. Больш таго, там-сям раённыя работнікі займаюцца шкоднымі апартуністычнымі разважаньнямі аб перазапасьці заданьняў. Прыкладам у гэтых адносінах можа служыць **Смалявіцкі** раён, аб якім мы сёньня зьмяшчаем матар'ял. З гэтымі разважаньнямі, са спробамі ўтаўць сваю бязьдзейнасьць, апраўдаць зрыў дзяржаўнага заданьня, проба весьці бязьлітасную барацьбу. Такія спробы павінны разглядацца, як нежаданьне весьці дзяржаўныя закупкі, як злоснае ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду.

Яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваем, што посьпех дзяржаўных закупак збожжа вырашае масава-растлумачальная работа. Ад таго, як разгорнута гэта работа сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, як папулярызуюцца дзяржаўныя закупкі і выгады ад іх у шырокіх масах працоўных вёскі, залежыць рэзультат закупачнай кампаніі. Аб гэтым з усёй выразнасьцю сьведчыць вопыт **Брагінскага** раёну, дзе ў выніку разгортваньня масавай работы ўжо выканана каля палову агульнага пляну (46,6 проц.). Няма сумненьня, што калі і Брагінскі раён ня здасьць тэмпаў, калі ён і надалей будзе неслюбна весьці работу ў візоўцы — у калгасах, сельсаветах, вёсках, — ён выканае поўнасьцю плян у найкарацейшы тэрмін.

На другім месцы стаіць **Случкі** раён, які выканаў 35,5 проц. заданьня (закуплена 365 тон збожжа). Але трэба сказаць, што Случкі раён, які мае найбольш буйны плян закупак (1.000 тон), працуе яшчэ слабымі тэмпамі. Ён павінен іх рэзка ўзмацніць, каб дабіцца своячасовага і пасьпяховага выкананьня пляну.

Весткі з месц паказваюць, што далёка ня ўсюды праўтаварныя фонды, вызначаныя для стымуляваньня прадаўцоў збожжа дзяржаўнае, скарыстоўваюцца па прызначэньні. У Чавусах, напрыклад, як мы сёньня паведамляем, гэтыя фонды ляжаць на базах сельспажыўтаварыстваў бяз руху, а мясцамі разбазарваюцца. Залача закупачных арганізацый — дабіцца выкарыстаньня вылучаных прамтаварных фондаў для максімальнага ўзмацненьня тэмпаў дзяржаўных закупак. За разбазараньне прамтавараў або выкананьне скарыстаньне іх трэба прыцягваць да самай суровай адказнасьці.

Першая дэкада красавіка — рашаючая ў дзяржаўных закупках збожжа. Мабілізуючы шырокія масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, вялучы несалабную барацьбу з кулаком, спэкулянтам і перакупшчыкам, партарганізацыі БССР павінна рашаючай перамогі на гэтым важным вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Перадавікі паказваюць прыклад

ЧЫРВОНАПОЛЬЛЕ.

ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ ЧЫРВОНАПОЛЬШЧЫНЫ ПАКАЗВАЮЦЬ ПРЫКЛАД ПАЛІТЫЧНАЙ СЬВЯДОМАСЬЦІ, ПРАДАЮЦЬ СВАЕ ЛІШКІ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ. КАЛГАС **«СЕРП І МОЛАТ»** ВЫВЕЗ НА ЗАКУПАЧНЫ ПУНКТ 15 ПУДОЎ ЗБОЖЖА, КАЛГАС **«НАВІНА»** — 5 ПУД., КАЛГАС **«ЧЫРВОНЫ УСХОД»** — 6 ПУДОЎ. ГЭТЫЯ КАЛГАСЫ ВЫКЛІКАЛІ НА САЦСПАБОРНІЦТВА ЎСЕ КАЛГАСЫ **ГАРАДЗЕЦКАГА** СЕЛЬСАВЕТУ.

П. БЯДУЛІН.

Прыгожая рэзалюцыя і... рэзультаты

СМАЛЯВІЧЫ.

Раённая кантора Загатзбожжа і райспажыўсаюз ня ўдзяраюць палец аб палец для разгортваньня па-ўдарнаму дзяржаўных закупак збожжа. 27 лютага гэта пытаньне стаяла на нарадзе старшынь сельспажыўтаварыстваў, але толькі «між іншым», у некалькіх словах. Праўда, рэзалюцыя прынята доўгая і прыгожая (на заданьне яе прайшло больш гадзіны!), **але практычнага дагэтуль зроблена вельмі мала.**

Пасобныя раённыя работнікі працуюць прыкрыць сваю бязьдзейнасьць разважаньнямі аб перазапасьці заданьня. Старшыня райспажыўсаюзу т. **Рубінчык** і член праўленьня т. **Малкін** кажуць: «У нашым раёне выканаць плян закупак немагчыма, бо перакупшчыкі і спэкулянты сустракаюць сялян за 2-3 клм. ад Смалявіч і закуп ляюць у іх збожжа». Як відаць, т. т. Рубінчык і Малкін чакаюць пакуль збожжа паплыве самацёкам і капітулюць перад спэкулянтамі і перакупшчыкамі. Яны ні разу ня выехалі ў вёскі, у калгасы для правядзеньня закупак. На мясцох калгасьнікі і аднаасобнікі нават ня ведаюць аб магчымасьці прадаць збожжа дзяржаве.

Гэта дзіва, што ў выніку такой «актыўнасьці» праўленьня райспажыўсаюзу, плян дзяржаўных закупак выкананы усяго... на 4,1 проц. З 6.000 цэнтн., вызначаных плянам, закуплена на 1 красавіка толькі 246 цэнтн.

СЬВЕДКА.

ХОД ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗАКУПАК ЗБОЖЖА ПА БССР

(у тонах)

ГАДАВЫ ПЛЯН	НА 15 САКАВІКА	НА 25 САКАВІКА	НА 1 КРАСАВІКА
33000	1591,7	2083	3275,4

АДСУТНІЧАЕ МАСАВАЯ РАБОТА

ЧАВУСЫ.

Дзяржаўныя закупкі збожжа ў Чавускім раёне не арганізаваны. Апарат райканторы Загатзбожжа не мабілізаваўся на баявое праведзеньне гэтай кампаніі. Масавая работа не разгорнута. У выніку плян закупак зрываецца. За ўвесь час закуплена 1.049 цэнтн. збожжа, што складае 14,9 проц. заданьня.

Прамтаварныя фонды, вызначаныя для стымуляваньня прадаўцоў збожжа дзяржаве, ляжаць на базах сельспажыўтаварыстваў бяз руху. У пасобных сельсаветах (Асіпаўскі, Антонаўскі) гэтыя фонды разбазарваюцца.

Штурмавік.

Пра абавязковую вывазку гною на палі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Прыймаючы пад увагу, што гной зьяўляецца найлепшым і найбольш поўным угнаеньнем, і што вывазка яго на палі ў зімовы час ішла недапушчальна слаба, СНК БССР пастанаўляе:

1. Лічыць скарыстаньне гною адным з асноўных аграмерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці, якое павінна праводзіцца ў абавязковым парадку. За нявывазку на палі гною на ніваватых пакладваць у адміністрацыйным парадку штраф да 100 р., або прымусовыя работы на тэрмін да 30 дзён, а ў выпадках злоснага невыкананьня — прыцягваць да судовай адказнасьці.

Напярэдадні дырэктараў саўгасаў і МТС, а таксама старшынь калгасаў, што за высіленьне глебы ў результаце бязьдзейнасьці і вялай работы па вывазцы гною, яны будуць персанальна прыцягвацца да крымінальнай адказнасьці.

2. Абавязаць РВК і сельсаветы ўстанавіць пастаянны кантроль за ходам вывазкі гною па кожным саўгасе, каапгасе, калгасе і па аднаасобных гаспадарках. Гаспадаркам, якія адстаюць у вывазцы гною, даваць сутачныя заданьні і штодзённа правяраць іх выкананьне.

Вывазку гною да веснавой сяўбы скончыць да 10 красавіка.

Адказнасьць за вывазку гною аднаасобнікамі ўскладзьці на старшынь сельсаветаў, ушаноўваючых вёсак і на самых аднаасобнікаў.

3. Прапанаваць сельсаветам дазваляць калгасам скарыстоўваць коняй аднаасобнікаў (у час, калі яны самі не вывозяць гной) для вывазкі гною на калгасныя палі — за плату і з забесьпячэньнем коняй кармамі калгасу, у адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 11 верасьня 1932 г. (З. З. СССР 1932 г., № 67, арт. 403).

4. Абавязаць РВК на працягу 2-х дзён давесьці гэту пастанову да кожнага саўгасу, каапгасу, калгасу, сельсавету і кожнай вёскі.

5. Штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва вывазкай гною па раёне ўкласьці персанальна на загадчыкаў райзо.

6. Абавязаць РВК рэгулярна, кожныя 5 дзён, прысылаць НК зямляробства па тэлеграфу весткі аб ходзе вывазкі гною.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР
К. БЭНЗІК.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
С. КАНДЫБОВІЧ.

29 сакавіка 1933 г.
Гор. Менск.

Ачысьціць калгас „Усход“ ад кулакоў і зладзеяў

(Ліст студэнта)

У Асіпавіцкім раёне за апошні час мелі месца факты злачынкага расхрастаньня і разбазараньня калгаснай маемасьці. У калгас «Усход» пралезьлі кулакі і антысавецкія элементы, якія захапілі кіраўніцтва ў свае рукі і разбураюць калгас. Некаторым з іх нават удалося пралезьці ў рады партыі.

Адным з найбольш актыўных ворагаў калгасу зьяўляецца **КАШКО АНДРЭЙ.** Да рэвалюцыі бацька яго меў буйную гаспадарку. Сам ён служыў добраахвотнікам у царской арміі, а ў часе грамадзянскай вайны дэзэртаваў з фронту. Перад масавым рухам калектывізацыі Кашко ідзе на хітрасьць. Ён робіць фіктыўны разьдзел гаспадаркі і частку яе прадае. Пасьля гэтага ідзе на пабудову чыгункі, пралазіць у прафсаюз. Вярнуўшыся зноў на вёску, пад выглядам беднака ўступае ў калгас, пралазіць у члены сельсавету і, урэшце, у партыю.

Уся далейшая дзейнасьць Кашко выразна паказвае яго сацыяльны твар. **Будучы членам сельсавету, КАШКО ўтаймае гаспадарку сваёй матні ад цьвёрдага заданьня і індывідуальнага падатку.** Для гэтага ён дапамагае матцы ўступіць у калгас «Усход» і разбазарыць сваю гаспадарку. Калі сельсавет пад націскам беднаты прымушан быў аштрафаваць матку на 100 руб., Кашко зрабіў усё, каб зьняць гэты штраф.

Дзейнасьць Кашко, як загадчыка гаспадаркі калгасу «Усход», адзначылася радам злачынстваў. У 1932 годзе ён забраў 81 куль акалоту, а калгасныя хлявы засталіся бяз строх і інвэнтар стаіць пад адкрытым небам. Калгасным збожжам Кашко распараджа ецца, як сваім і бяро для сябе колькі хоча. Карыстаючыся правам брыгадзіра, ён у часе ўборкі сена прысвоіў сабе лішнія працадні, вымяраючы іх у іншых.

Кашко меў цесную сувязь з сэктай эвангелістаў. Гэтыя сэктанты вялі агітацыю супроць саўгадаўніцтва.

Некалькі разоў стаяла пытаньне на сходзе калгасьнікаў, якія патрабавалі аддаць Кашко пад суд. Але таму, што ў калгасе ёсьць «свае людзі», пытаньне гэта было змазана. Не рэагавалі на яго дзейнасьць і іншыя мясцовыя арганізацыі. Маўчала пракуратура. Усё гэта развязала рукі клясавым ворагам.

Загадчык жывёлагадоўчай фэрмы **СЫЧОЎ** таксама злачынна адносіцца да калгаснай маемасьці. Ніякага догляду калгасный жывёлы няма. Яго жонка **СЫЧОВА М.** памарыла голадам 50 проц. цялят, а калгаснымі хартамі выкармліла сваіх кабаноў.

Гэта кулацкая зграя скарыстоўвае чыстку калгасаў для таго, каб вызваліцца ад беднякоў, якія перашкаджаюць ім шкодзіць. Выключан з калгасу **ШЭЎЧЫК — БЯДНЯК,** які першым ўступіў у калгас. Шэўчык добрасумленны работнік. Змагаўся заўсёды за якасьць работы і душой хварэў за калгас. Затое **ФЕСЬКО** — сын былога валаснога старшыні, чалавек, які справаў 5 га сенажаці, застаўся ў калгасе.

Праца кулацкай групы ў калгасе працякала пры поўным кантакце і падтрымцы з боку старшыні сельсавету **РУДОГА.** Хто такі Руды? Былы афіцэр старой арміі, які за «выдатную службу» атрымліваў мадалі, а пасьля рэвалюцыі пралез у рады партыі.

Мясцовыя камуністы аказаліся на поводзе ў клясавага ворага. Сакратар партячэйкі калгасу «Усход» **ШЫБІРЫН** адарваўся ад асноўнай масы калгасьнікаў. Ён ня можа разабрацца ў сваласаблівасьцях клясавай барацьбы на вёсцы.

Партарганізацыя ім. Сьвісла не змагла выкрыць клясав

АНТЫСАВЕЦКІЯ ВЫБРЫКІ ФАШЫСЦКІХ БАНДЫТАЎ

Налёт на гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Лейпцыгу

БЭРЛІН, 1. 1-га красавіка ў памяшканьне аддзяленьня гандлёвага прадстаўніцтва Савецкага саюзу ў ЛЕЙПЦЫГУ зьявіўся атрад нацыянал-сацыялісцкіх штурмавікоў, і прыступіў да вобыску. Праз некаторы час сюды зьявіўся атрад рэгулярнай паліцыі і члены дапаможнай паліцыі, якія разам з штурмавікамі працягвалі вобыск. Усе супрацоўнікі аддзяленьня прайстаўніцтва былі сагнаны ў калідор.

Арыштаваўшы кіраўніка аддзялення Янкалена і яго намесьніка Ранінсона, нацыянал-сацыялісцкія штурмавікі накіраваліся ў клюб савецкіх супрацоўнікаў у Лейпцыгу, дзе таксама зрабілі вобыск, канфіскаваўшы рад савецкіх кніг, у тым ліку журнал «Бальшавік».

Зьдзекі над савецкімі грамадзянамі прадаўжаюцца

БЭРЛІН, 1. У Бэрліне над 8 савецкімі грамадзянамі зьдзекваліся нацыянал-сацыялісцкія штурмавікі. Найбольш цяжкі выпадак адбыўся з савецкім грамадзянінам **Шаякам**, па пра фесіі шаўцом.

Нацыянал-сацыялісты сталі наклейваць на вокны яго майстэрні плякаты, заклікаючыя да байкоту яўрэяў. Калі Шаяк папрабаваў зьняць плякаты, штурмавікі ўварваліся ў майстэрню і зьбілі яго. Шаяк падаў скаргу ў савецкае консульства ў Бэрліне. Пасьля гэтага штурмавікі зьявіліся паўгорна, зрабілі вобыск, арыштавалі Шаяка і адвезьлі яго ў казарму, дзе **пагражаючы рэвальвэрам, загадалі распрануцца і пачалі біць яго сталёвымі прутамі.** Збіты да крыві Шаяк быў выкінуты на вуліцу, прычым яму было заяўлена, што калі ён пасьмее скардзіцца, яго прыкончаць. **Мэльцьянскі агляд устанавіў сьляды зьбіваньня прутамі па ўсёй сьпіне.** Рубашка на Шаяку разарвана і на ёй відаць плямы крыві.

Вобыскі на савецкіх параходах

БЭРЛІН, 2. Учора ў **Гамбург** прыбыў савецкі пароход далёкага сьледаваньня «**Днепрабуд**» з грузам соі, макухі і інш. Увечары па тэлефону генэральнаму консулу СССР у Гамбургу было павядомлена, што паліцыя мае намер зрабіць вобыск на параходзе «**Днепрабуд**». Калі консул запытаў аб прычынах вобыску, яму заявілі, што там шукаюць зброю. Консул рашуча пратэставаў супроць вобыску. Паліцыя зьявілася на пароход і зрабіла, у прысутнасьці консула, вобыск, які ня даў ніякіх рэзультатаў.

2-га красавіка, раніцай, у **Гамбург** прыбыў савецкі пароход «**Андрэ Марці**» з грузам соі, макухі і інш. Савецкі консул зноў быў папярэджан па тэлефону, што паліцыя мае намер зрабіць вобыск на параходзе, супроць чаго консул са свайго боку рэзка запратэставаў. Калі на пароход прыбыў консул, капітан параходу заявіў яму, што паліцыя ўжо была, але капітан заявіў, што рабіць вобыск, не папярэдзіўшы консула, бяз яго прысутнасьці ён дапусьціць ня можа. Вобыск ня быў зроблен. **Генэральны консул Гамбургу заявіў сёньня мясцоваму сэнату рашучы пратэст супроць таго, што ў адносінах савецкіх параходаў устаноўлены асобныя паралкі.**

180 ГОД КАТАРГІ ДЛЯ СЯЛЯН ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Акупацыйная палітыка фашысцкага ўраду, на фоне глыбокага эканамічнага крызісу, прывяла шырокія масы працоўнага сялянства да поўнага разбурэньня і галечы. Ня гледзячы на гэта, падатковая шруба зацісканецца ўсё мацней. Продаж сялянскай маемасьці з малатка зьяўляецца штодзённым зьявішчам у Заходняй Беларусі. Даведзеныя да рэспачы сяляне становяцца на шлях адкрытай барацьбы з акупантамі. Барацьба працоўнага сялянства супроць акупантаў набывае ўсё больш арганізаваны характар, ад асобных разрозненых выступленьняў перахо дзіць у выступленьні цэлых гмін і паветаў.

У 1931 г. у вёсцы Асташыно распачалася масавая барацьба супроць сялгвостраў. Сяляне зьбілі і прагналі сялгвостраў і ў тую-ж ноч спалілі сядзібу асадніка, які купіў рэквізаваную за падаткі маемасьць сялян. Першы налёт паліцыі сяляне адбілі пры дапамозе самаабароны і прыгатаваліся да новага нападу, паведаміўшы аб гэтым вакольныя вёскі. На заўтра прыбыло 150 чалавек паліцыі, якая пачала арыштоўваць сялян. Сяляне некалькіх вёсак уступілі ў бой з паліцыяй, адбілі арыштаваных і прагналі паліцэйскі атрад. Пасьля гэтага пачалася карная экспэдыцыя з масавымі арыштамі і забойствамі сялян. 18 чалавек былі арыштаваны і адданы пад суд за ўдзел у выступленьні.

Як паведамляе «**Кур'ер Віленскі**», віленскі акруговы суд **прыгаварыў усіх 18 сялян ад 5 да 15 год катаргі, разам на 108 год, з пазбаўленьнем праў на 180 год.**

***

28 лютага ў акруговым судзе ў **Навагрудку** адбыўся палітычны працэс **над 7 сялянамі**, па абвінавачваньні ў антыдзяржаўнай дзейнасьці. На лаве падсудных былі: **Анікей Раман, Моніч Раман, Краскоўскі Мікалай, Самасей Ян** (усе з в. **Рамзінкі**, Ішчароўскай гміны), **Кунейка Антось** з в. Астапаўшчыны, **Давідовіч Сымон і Давідовіч Пётра** з в. Дольна.

Акруговы суд прыгаварыў **Рамана на 6 год катаргі, Кунейку Антося, Моніча Рамана, Краскоўскага Мікалая, Давыдовіча Сымона і Самасея Яна на 5 год катаргі кожнага; Давідовіча Пятра на 4 гады. Усіх з пазбаўленьнем правоў на 10 год.**

Зьдзекі над савецкімі грамадзянамі прадаўжаюцца

БЭРЛІН, 2. Учора, 1-га красавіка, атрад штурмавікоў зьявіўся на кватэру савецкага грамадзяніна, доктара **Прыгожына**, які пражывае ў **Бэрліне** на Лютэрштрасэ, № 10, і зрабіў вобыск. Ня гледзячы на тое, што вобыск ня даў ніякіх вынікаў, Прыгожына, а таксама яго брата, які пражывае пастаянна ў Бэльгіі, пацягнулі ў памяшканьне штурмавікоў на Курфюрстэштрасэ № 10. Брата Прыгожына, які не зьяўляецца савецкім грамадзянінам, праз некаторы час выпусьцілі. Жонка арыштаванага Прыгожына, атрымаўшы вестка, што яе муж у памяшканьні штурмавікоў, пашла туды, каб пабачыць яго. Ёй паведамілі, што муж пераведзен у казарму штурмавікоў на Генэраль Папэнштрасэ. У гэтай казарме жонцы Прыгожына было пацьверджана адным нацыянал-сацыялісцкім штурмавіком, што яе муж сапраўды там, але было адмоўлена даць якія-б там ні было даведкі. Паўпрадзтвам Савецкага саюзу ў Бэрліне прадпрыняты адпаведныя крокі для вызваленьня Прыгожына.

Вал. Мядзьведзеў

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД ПАНАВАНЬНЕМ АКУПАНТАЎ.

Самагубствы яўрэяў у дзень абвяшчэньня байкоту

БЭРЛІН, 2. Агенцтва «Конці» паведамляе, што ў Франкфурце-на-Одэры ў дзень антыяўрэйскага байкоту, уласьнік яўрэйскай тэкстыльнай фірмы Мэйер і яго жонка пакончылі жыцьцё самагубствам.

Апрача паведамленьня аб самагубстве яўрэйскага ўласьніка трыкатажнага прадпрыемства Мэйера з жонкай, ёсьць афіцыяльнае паведамленьне, што ў дзень антыяўрэйскага байкоту пакончыў самагубствам адзін з акцыянераў трыкатажнай фабрыкі «Марша», Франк Закс, у Хэмніцы. Яўрэй Закс застрэліўся, атрымаўшы папярэджаньне, што яму пагражае арышт.

***

БЭРЛІН, 2. Паліцэй-прэзыдэнт Дзюсэльдорфу распарадзіўся спыніць выдачу заграничных пашпартаў яўрэям, бо, паводле вестак агенцтва Вольфа, за апошні час вялікая колькасьць яўрэяў зьбіраецца пакінуць Германію.

Менск выканаў плян мабілізацыі сродкаў

Сакратару Менгаркому КП(б)Б тав. **Гікало.**

Старшыні Менгарсавету тав. **Каранеўскаму.**

Наркому фінансаў тав. **Хацкевічу.**

Гарпрафсавету—тав. **Шулькіну.**

ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў — тав. **Кайкову.**

Рэдакцыі газеты «Зьвязда»

РАПАРТ

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам гаркому КП(б)Б на чале з тав. Гікало, пры актыўнай дапамозе гарпрафсавету і гаркому камсамолу, ударнікаў фінфронту і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, Менгарфа **плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу на** 1 красавіка выкананы па наступных паказальніках: па аграмаджаным сэктары—**106,5 проц.**, па прыватным—**100,3 проц.**

Заг. Менгарфа ЕЛІНЕЎСКІ.
Сакратар парт'ячэйкі ЗЛЬПЭРЫН.
Старшыня МК АКСЕЛЬРОД.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС

З 1 красавіка Народны камісар замежных спраў тав. Літвінаў заявіў германскаму паслу п. фон-Дзірксену энэргічны пратэст супроць зьбіваньняў савецкіх грамадзян, бесчалавечных абыходжаньняў з імі, супроць незаконных і няўгрунтаваных арыштаў гэтых грамадзян і вобыскаў у аддзяленьнях гандлёвых прадстаўніцтваў і на савецкіх параходах, а таксама аграбленьня савецкіх гаспадарчых арганізацый.

(ТАСС).

ПРЫПАДАК ШАЛЕНСТВА НАЙМІТАЎ ДЭТЭРДЫНГА

Працоўныя Савецкага саюзу ніколі не сумняваліся ў тым, што германская контр-рэвалюцыя, якая пераварае цэнтральную Эўропу ў парахавы погроб, з першых-жа дзён свайго прыходу да ўлады стане прыцягальным цэнтрам для ўсёй эўрапэйскай і сусьветнай антысавецкай сволачы. Гітлераўская гвардыя прыклала ўсе сілы да таго, каб даказаць, што яна зьяўляецца самым паслухмяным наймітам антысавецкіх інтэрвэнтаў. САМЫМ ПАСЛУХМЯНЫМ І ПОДЛЫМ.

Ніколі яшчэ ні ў адной краіне цкаваньне Савецкага саюзу не набывала такіх разьмераў і такога характару, як у цяперашняй фашысцкай Германіі. Ні адзін буржуазны ўрад не дазваляў сабе такіх актаў, якія сталі штодзённай практыкай германскіх улад.

Ні ў адной краіне пануючыя клясы не дазволілі сваім наймітам так бесцэрамонна і беспакарана грабіць гандлёвыя прадпрыемствы чужой дзяржавы, у даным выпадку гандлёвыя прадпрыемствы Савецкага саюзу і сыстэматычна зьбіваць яго грамадян толькі таму, што гэта пажадана адпаведным колам, напрыклад, нафтавым каралём трэцяй краіны. Гэта дазволіў сабе толькі прадажны мілітарыст, былы манчжурскі сатрап Чжан Цзо-лін, капі ён па загаду сваіх гаспадароў — ангельскіх і японскіх імпэрыялістаў, зрабіў налёт на савецкія ўстановы ў Бэйліне ў 1927 годзе. Германскія сатрапы далёка пакінулі за сабой нават Чжан Цзо-ліна.

Усім вядома, што гэты выдатнейшы ў свой час кітайскі мілітарыст ніколі не абараняў інтарэсаў Кітаю. Ён клапаціўся аб сваёй кішэні. Аб чыіх інтарэсах клапоцяцца гітлераўскія хуліганы? Чыю кішэню яны абараняюць? У імя чаго наладжваецца антысавецкі пагром па ўсёй «трэцяй імпэрыі»?

Расстаноўка сіл ясная: ДЭТЭРДЫНГ ЗАГАДВАЕ, ГІТЛЕР ДЗЕЙНІЧАЕ. Антысавецкія пагромы нападжваюцца фашыстамі ў Германіі ў імя інтарэсаў «Роять Дэйч компані». Германскіх працоўных фашысты хочуць ператварыць ня толькі ў нявольнікаў германскай буржуазіі, але і ў нявольнікаў Дэтэрдынгаў, а ўсю Германію — у антысавецкі пляцдарм.

Нельга, зразумела, тлумачыць бязчынствы фашыстаў у аддзяленьнях Дэрпу «стыхійным» праяўленьнем фашысцкага тэрору. Не, як відаць, тут добра адчуваецца вопытная, кіруючая рука. Праўда, Дэрпо — таварыства заможнае, яго звароты немалыя і гэта, нясумненна, магло прыцягнуць да дэрпоўскіх кас фашысцкіх галаварэзаў. Налёты на аддзяленьні Дэрпу невыпадковыя, яны суправаджаюцца амаль усюды грабежніцтвамі і нават поўным раскрадваньнем. Але ня толькі магчымасьць пажывіцца прыцягвае фашысцкіх бандытаў. Зрыву савецка-германскіх гаспадарчых адносін — вось чаго дабіваюцца наймітыі сусьветнай контр-рэвалюцыі. На першым пляне раней за ўсё стаіць гэта ПАЛІТЫЧНАЯ МЭТА. Фашысцкія атрады дзейнічаюць па пляну, выходзячы з пэўнай установкі. У чым заключаецца гэта ўстаноўка, якая ўбіваецца ў галовы фашысцкіх штурмавікоў, відаць з адказу, данага савецкаму грамадзяніну Перкану яго мучыцелямі: «30 СТУДЗЕНЯ, — ЗАЯВІЛІ ЯМУ ФАШЫСЦКІЯ КАТЫ, — ДЛЯ НАС НЯ ІСНУЕ НІЯКІХ ДАГАВАРОЎ З СССР, ТУТ ГЕРМАНІЯ І МЫ ТУТ ГАСПАДАРЫ».

Гэта зусім невыпадковая заява аднаго з наймітаў Дэтэрдынга раскрывае ўвесь сэнс апошніх тэрарыстычных мерапрыемстваў фашысцкага рэжыму супроць савецкіх арганізацый у Германіі і савецкіх грамадзян. Адказнасьць за гэтыя правакацыі нясе ня толькі нацыянал-сацыялісцкая партыя, — з гэтай контр-рэвалюцыйнай бандай нам няма чаго гутарыць, — адказнасьць нясуць германскі ўрад, яго упаўнаважаныя. СЬМЕШНЫМІ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА НІЧОГА НЯВАРТЫЯ ДЭКЛЯРАЦЫІ ГІТЛЕРА АБ САВЕЦКА-ГЕРМАНСКІХ АДНОСІНАХ. КАЛІ ЎРАД НЯЗДОЛЕН УЦІХАМІРЫЦЬ ФАШЫСЦКІЯ БАНДЫ. Дэкларацыям ня верыць, ім грошцана, калі ЯНЫ ЗЬНІШЧАЮЦЦА ДЗЕЯНЬНЯМІ.

Германская контр-рэвалюцыя сьвядома правакуе народы Савецкага саюзу. Усе мэтады сваёй «унутраной палітыкі», г. зн. палітыкі тэрору, правакацый, шантажу і вымаганьняў, яна пераносіць і ў замежную палітыку; яна пашырае гэтыя мэтады на ўзаемаадносіны са сваімі суседзьмі і ў асаблівасьці на ўзаемаадносіны з СССР. Іменна таму, што САВЕЦКІ САЮЗ ЗАЎСЁДЫ ЗЬЯЎЛЯЎСЯ АДЗІНАЙ КРАІНАЙ, ЯКАЯ НЯ МАЕ ВАРОЖЫХ ПАЧУЦЬЦЯЎ ДА ГЕРМАНСКАГА НАРОДУ, іменна таму, што самыя шырокія працоўныя масы Германіі адчуваюць глыбокія сымпатыі да СССР, іменна таму, нарэшце, што германская контр-рэвалюцыя, нібы вулічная дзеўка, прапануе сябе любой антысавецкай групоўцы, — іменна таму фашысты імкнуцца справаказаваць канфлікт і тым самым апраўдаць надзеі міжнароднай рэакцыі. Джансон Хікс, які праславіўся як узломшчык сэйфаў Аркоса, пёрд Керзон — душа антысавецкага фронту ў недалёкім мінулым, — гэтыя інтэрвэнцыяністскія «героі» павінны ад прыкрасьці перавярнуцца ў труне. У параўнаньні з антысавецкімі геройскімі ўчынкамі фашыстаў яны — жаўтаротыя птушаняты.

Германскі фашызм становіцца пагрозай міру ў Эўропе. У Бэрліне гэта ведаюць ня горш за нас. Але, відаць, там канчаткова страцілі здольнасьць думаць.

Фашысцкія кіраўнікі пераацэньваюць свою зпавесную і разам з тым мізэрную ролю, надзяваючы на сябе блаваньскія каппакі XVIII стагодзьдзя і атручваючы палітычную атмасфэру Эўропы сваімі бясчынствамі.

Калі германскія фашысты дагадваюць Дэтэрдынгу — гэта «унутраная» справа германскага ўраду. Калі ён жадае выслужыцца перад сусьветнай рэакцыяй — гэта таксама дэтычыць ня аднаго. Але калі фашысцкія банды ў прыпадку старанасьці пераходзяць усякія граніцы, дык гэтым панам трэба напомніць, што ніхто ім не дазволіць працягваць свае рукі да савецкага добра і зьдзекавацца над грамадзянамі Савецкага саюзу! («Правда»).

Канфіскацыя маемасьці Эйнштэйна

БЭРЛІН, 2. Як паведамляе агенцтва «Конці», чыноўнікі прускага міністэрства ўнутраных спраў распарадзіліся канфіскаваць грошы прафэсара Эйнштэйна, якія знаходзіліся ў адным з бэрлінскіх банкаў. Канфіскавана 30 тысяч марак. Матывіроўка распараджэньня гаворыць, што гэтыя грошы «прызначаліся для антыгерманскіх мэт».

III ПЛЕНУМ ЦС АСОАВІЯХІМУ БССР

Па дакладу тав. ЭЙДЭМАНА разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі, у якіх прымала ўдзел каля 25 чалавек. Дэлегаты пленуму падвергні жорсткай крытыцы і самакрытыцы работу цэнтральнага савету і яго нізавых зьвеньняў.

У спрэчках асабліва адзначалася дрэнная работа ЦС Асоавіяхіму ў галіне ўзмацненьня нізавога зьвяна—ячэйкі, падрыхтоўкі асоавіяхімаўскіх кадраў і г. д.

У заключным слове тав. ЭЙДЭМАН указаў на рад практычных задач, якія стаяць перад беларускай арганізацыяй Асоавіяхіму.

На ранішнім пасяджэньні 2 КРАСАВІКА начальнік аргмасавага аддзелу ЦС Асоавіяхіму БССР тав. КУРГАН выступіў з дакладам аб удзеле Асоавіяхіму ў веснавой сяўбе.

Дакладчык указвае, што ў гэтай галіне ёсьць буйнейшыя недахопы. Ня ўсе асоавіяхімаўскія арганізацыі зразумелі ўсю палітычную важнасьць і значэньне пасьпяховага правядзеньня сяўбы. Масы членаў Асоавіяхіму не мабілізаваны на барацьбу за сяўбу, за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ачыстку калгасаў ад кулацкіх і іншых клясава-варожых элемэнтаў.

Ячэйкі і саветы Асоавіяхіму пры МТС і саўгасах, ня гледзячы на тое, што «МТС і саўгасы заваявалі сабе моцныя месца ў сацыялістычнай сельскай гаспадарцы ў якасьці арганізатараў абагуленай гаспадаркі» (з рэзалюцыі студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), ня сталі яшчэ баявымі памочнікамі партарганізацый у забесьпячэньні сацыялістычнага ўплыву на калгасныя ячэйкі і сапраўднымі арганізатарамі абарончай работы на вёсцы. Замест вядучай ролі ў разгортваньні абарончай работы на вёсцы, многія ячэйкі Асоавіяхіму МТС і саўгасаў амаль у такой-жа меры паказваюць узоры слабай работы, як і ячэйкі раду калгасаў.

Кіраўніцтва вясковых арганізацый Асоавіяхіму — ад ячэйкі да райсавету (Слуцак, Жлобін, Віцебск) не праявіла неабходнай клясавай пільнасьці, што прывяло да засьмечанасьці пасобных зьвеньняў Асоавіяхіму клясава-варожым элемэнтам.

Тав. КУРГАН адзначае, што вопыт перадавых саўгасных і калгасных ячэек Асоавіяхіму (Крычаў, Барысаў, Вузда) не падхоплен і ня вывучан адстаючымі ячэйкамі. Між тым, гэты вопыт заслугоўвае асаблівай увагі. Напрыклад, асоавіяхімаўская ячэйка калгасу «Праца», Кашанскага сельсавету, Крычаўскага раёну, уключыўшыся ва ўсесаюзны конкурс на лепшую калгасную ячэйку па ўзорным правядзеньні сяўбы, правяла значную работу. Усе калгасьнікі ўступілі ў Асоавіяхім і ахоплены членствам. Члены Асоавіяхіму разьбіты на брыгады па вытворчым прынцыпе. Брыгады асоавіяхімаўцаў своячасова закончылі збор і ачыстку насеньня, адрамантавалі поўнасьцю інвэнтар, сабралі 30 пудоў попелу і ачысьлі дапамогу суседняму калгасу «Іскра», выдаўшы яму 5 тон насеннай бульбы.

У гэтым калгасе ячэйка шчыльна ўвязала падрыхтоўку да сяўбы з разгортваньнем масавай вайсковай прапаганды і вучобы. Рэгулярна працуе стралковы гурток. Арганізаван гурток па ліквідацыі хэмічнай няпісьменнасьці.

У калгасе імя Сталіна, Камянецкага сельсавету, Вузьдзенскага раёну, члены Асоавіяхіму ў часе нядзельніка сарталі 50 цэнтн. насеньня, сабралі 8 цэнтн. попелу і г. д.

Дапрызыўны парасовачны пункт Барысаўскага раёну правёў вялізарную работу ў калгасах. Сабрана 27 тон попелу, адрамантавана 44 плугі, 5 борон, 52 капёсы, ачышчана і пратручана 98 цэнтн. насеньня, вывезена на палі 1.063 возы гною.

Тав. КУРГАН высоўвае рад задач, якія стаяць перад асоавіяхімаўскімі арганізацыямі БССР. Неабходна шырока выкарыстоўваць вопыт бэзанчуцкіх калгасьнікаў, вылучыўшы спэцыяльны агітпаград па растлумачэньні канкрэтных выгад закону аб абавязковай адчы зобжка дзяржаве.

Рад задач стаіць у галіне падрыхтоўкі кадраў, садзейнасьці рамонту с.-г. інвэнтару, выробу запасных частак і г. д.

Работа кожнага райсавету і ячэйкі Асоавіяхіму будзе ацэньвацца па канкрэтных паказальніках удзелу ў веснавой сяўбе і спагучаньні гэтай работы з пропагандаваньнем вайсково-масавай прапаганды.

У спрэчках па гэтаму дакладу выказаліся 12 чалавек.

На ранішнім пасяджэньні 3 КРАСАВІКА пленум заслухаў даклад загадчыка вайсковага аддзелу ЦК ЛКСМБ тав. ГОЛЬДМАНА аб падрыхтоўцы да чарговага прызыву і задачах работы сярод моладзі.

Паведамленьне

Ніжэй пералічаныя таварышы павінны 4-га красавіка а 2 гадз. дня зьявіцца ў Культпроп ЦК КП(б)Б (5-ты паверх, сэктар прапаганды): Эльлянаў, Ларачкін, Сокаль (курсы партактыву), Кушныроў, Кійко, Узідзеўская (музэй рэвалюцыі), Пугачоў, Балотнікаў (інстытут гісторыі партыі) Казакоў, Пружыніна, Улазаў (НКА), Зарамбоўскі (ЦП саюзу працасьветы), Лібэнзон, Скуман (Бімаз), Паплкоў (менская СПШ), Лубенскі (ЦК ЛКСМБ), Асаўлак, Вальфсон (ГК КП(б)Б).

Сакратар Культпропу ЦК КП(б)Б ХОДАРАЎ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПАСТАНОВА

калегіі НКЗ БССР ад 29 сакавіка 1933 г.

Аб ходзе складаньня вытворчых плянаў і арганізацыі пастаянных брыгад у калгасах

Складаньне вытворчых плянаў у калгасах на 1933 г. і арганізацыя пастаянных брыгад праходзяць абсалютна нездавальняюча.

Райсаветы, упаўнаважаныя трактарацэнтраў і дырэктары МТС по забясьпечылі скалчэньня гэтай работы да ўстаноўленага ЦК і СНК тэрміну — 25 сакавіка 1933 г.

Па вестках на 25 сакавіка 1933 г. вытворчыя пляны складзены ў 44,3 проц. калгасаў.

Рад МТС не давялі да калгасаў і брыгад пляну гадавых работ трактараў, у выніку чаго калгасы ня могуць скласьці сваіх вытворчых плянаў і ўстанавіць для брыгад канкрэтных гадавых заданьняў.

У той час, як асобныя раёны з посьпехам разгортваюць работу па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад (Брагінскі — на 98 проц., Чырвона-Слабодзкі — 94 проц., Плешчаніцкі — 83 проц.), рад раёнаў зусім адстаюць у гэтай рабоце (Чавускі 6,3 проц., Шклоўскі — 11,6 проц., Чырвонапольскі 11,4 проц., Парыцкі — 13,6 проц. і Аршанскі — 16,1 проц.).

Раёны Вушацкі, Сіроцінскі, Бешанковіцкі, Дубровенскі, Слуцкі, Пропойскі, Веткаўскі, Мазырскі, Глускі і Лоеўскі, ня гледзячы на неаднаразовыя тэлеграфныя запатрабаваньні НКЗБ, ні разу не даслалі вестак аб ходзе работы па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад.

У радзе калгасаў вытворчыя пляны складаюцца бяз шырокага ўдзелу калгасных мас, не зацьвярджаюцца агульнымі сходамі калгасьнікаў.

Па Бярэзінскім раёне з 47 складзеных плянаў, зацьверджана толькі 12, па Менскім раёне са 125 зацьверджана толькі 50.

Наркамзем БССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць усе райсаветы і МТС забясьпечыць скалчэньне работы па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад, увядзеньні зьвяньняў і выдачы гадавых заданьняў брыгадам у бліжэйшыя дні.

2. Мабілізаваных па пастанове ЦК КП(б)Б 17 студэнтаў с.-г. аддзяленьня Плянава-эканамічнага інстытуту для дапамогі калгасам у складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад накіраваць у найбольш адстаючыя раёны, тэрмінам да 20 красавіка 1933 году.

3. Райсаветы і МТС неадкладна пераключыць увесь агратэхнічны персанал і інструктароў на работу па ўвядзеньні севазваротаў, па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад у калгасах.

4. За шпараваньне патрабаваньняў НКЗБ аб дасылцы вестак пра ход работы па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад абвясьціць вымову загадчыкам райсаветаў: Вушацкага тав. **Красоўскаму**, Бешанковіцкага тав. **Гараўцу**, Дубровенскага тав. **Платаісу**, Слуцкага тав. **Каханові**чу, Пропойскага тав. **Самуйлаву**, Веткаўскага тав. **Чарэйка**, Мазырскага тав. **Разэвіновічу**, Глускага тав. **Магілеўцу**, Лоеўскага тав. **Доўгаму**. **Папярэдзіць загадчыка Сіроцінскага райсавета тав. Самусевіча**, што калі ў бліжэйшыя дні ня будуць прадстаўлены весткі, да яго будуць ужыты меры ўзьдзейнасьці.

У сувязі з тым, што па Дубровенскім раёне ёсьць рад прарываў у падрыхтоўцы да веснавой пасеўкампаніі, даручыць Арганізацыйна-інструктарскаму сэктару, пад адказнасьць Серавальскага, камандзіраваць не пазней 1 красавіка 1933 г. інструктара для поўнага абсьледаваньня работы Дубровенскага райсавета. **Вынікі абсьледаваньня прадставіць Калегіі НКЗБ да 7 красавіка гэтага году.**

5. Папярэдзіць загадчыкаў райсаветаў — Чавускага тав. **Свадкоўскага**, Шклоўскага тав. **Буйвалава**, Ямрвонапольскага тав. **Лемяшонка**, Парыцкага тав. **Буселя** і Аршанскага тав. **Жылінко**, а таксама ўсіх астатніх раёнаў, у якіх дрэнна праходзяць работы па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад, што калі ў бліжэйшыя дні ня будзе скончана гэта работа, да іх будуць ужыты суровыя меры ўзьдзейнасьці.

6. Упаўнаважаным трактарацэнтраў налажыць спагнаньні на тых дырэктароў МТС, у якіх дрэнна праходзіць работа па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад у калгасах, і забясьпечыць неадкладнае выкананьне пастановы ЦК і СНК ад 9 сакавіка 1933 г. аб тым, што пляны гадавых работ вытворчых вучасткаў МТС абавязкова даводзіцца да кожнай вытворчай калгаснай брыгады.

7. Абавязаць усіх загадчыкаў райсаветаў, пачынаючы з 30 сакавіка да скончэньня работы па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад, на пяцідзённых дасылаць у Наркамзем тэлеграфныя паведамленьні аб ходзе гэтай работы.

Даручыць тав. **Залескаму** сёньня тэлеграфна паведаміць усім райсаветам аб прынятых рашэньнях і ўстанавіць адзіную форму пяцідзённых тэлеграфных паведамленьняў райсаветаў пра ход работы па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад.

8. Выклікаць для дакладу аб ходзе работы па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад па наступнае пасяджэньне калегіі НКЗБ 3-х загадчыкаў райсаветаў, 2-х дырэктароў МТС, 2-х старшынь і 2-х брыгадзіраў калгасаў з кожнага з выклікаемых раёнаў. Сьпіс раёнаў устанавіць тав. Залескаму.

Нарком Земляробства БССР РАЧЫЦКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)
Маст. кіраўн. ЛІТВІНАЎ.
СЁНЬНЯ Л. і П. Тур.
ЗЕМЛЯ І НЕБА
п'еса ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 гадз.

Чырв. Зорка-КАСА—ад 1 г. дня. Гукавы маставкі фільм МАЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА
Дзіцячы гукавы КІНО-ТЭАТР Каса з 12 г. дня. З 1 красавіка новы маставкі фільм РАЗАМ з БАЦЬКАМІ
«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» КАСА—ад 2 г. дня. Усходні маставкі фільм ДВА ПАЛЯЎНІЧЫЯ
ПРАЛЕТАРЫ ТАЙНА МАЯКА драма ў 7 ч.
„СПАРТАК" Каса з 2 г. 30 м. дня. Выдатны фільм ПАЛАЧЫ драма ў 8 частках

Для фак-ту НАРГАСВУЧОТУ пры плякава-эканам. інстытуце
СЭКТАР КАДРАЎ ВОСУ
арганізуе
2 групы 4-мес. падрыхтоўчых курсаў
(1 гр. без адрыву ад вытворчасьці).
Частка курсантаў забясьпечваецца стыпэндыяй. Інтэрнатам не забясьпечваюцца.
Заявы з дакумантамі: аб сац. паходжаньні і становішчы, аб узросьце, аб адукацыі (ня менш 8 груп або 7-годка з дадатковай самаадукацыяй) і заверная анкета прымаюцца
да 12 красавіка
ў канцылярыі ВОСУ
(Менск, Камуністычная, 16, пак. № 10) ад 12 да 2 гадз.

Беларускае Аддзяленьне
„ДАМЭЦ"
даводзіць да ведама ўсіх фабзаўкомаў, мясцкомаў і іншых зацікаўленых арганізацый,
ШТО
з 10 красавіка г. г.
ПРЫМАЮЦЦА заяўкі
НА ПРАДМЕТ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ
МАЙСКІХ ДЗЁН
КАНЦЭРТНА-ЭСТРАДНЫМІ ВЫСТУПЛЕНЬНЯМІ АРТЫСТАЎ ЛЕНІНГРАДЗКАГА ДАМЭЦ'у.
Пры падпісаньні дагавору вышэйуказаныя арганізацыі павінны забясьпечыць сваіх прадстаўнікоў даверанасьцю на права падпісаньня дагавору.
Заяўкі прымаюцца штодзённа з 10 да 4 г. 30 м.
АДРАС: Універсытэцкая, 12, клюб мэтадістаў, тэл. № 22—755.
БЕЛДАМЭЦ.

Сіроцінскае аддзяленьне Дзяржбанку
ПРАДАЕ
за неаплату рахункаў фактур наступныя тавары райсаюзу:

1. Заяўкі	на	2200	руб.
2. Пасуда	„	1658	„
3. Мяшкоўніны	„	1912	„
4. Трэфы	„	8200	„
5. Сковарады	„	2044	„
6. Петлі	„	11548	„
7. Хусткі	„	21272	„
8. Перац	„	4749	„
9. Адзеньне	„	21326	„
10. Абутак	„	14637	„
11. Трыкатаж	„	4652	„
12. Дзёгаць	„	5296	„
13. І н ш.	„	5880	„

За даведкай зварачацца: Сіроцінскае Аддзяленьне Дзяржбанку.

МЕНГАРЗДРАЎ
з 4 красавіка 1933 г. абвяшчае
перарэгістрацыю
ўсіх дактароў,
ЗУБНЫХ ДАКТАРОЎ, ФАРМАЦЭЎТАЎ, МЭДСЯСЬЦЭР, ЛЕКПОМАЎ І АКУШОРАК.
Рэгістрацыя будзе праводзіцца ў памяшканьні Гарздраву (Пляц Волі, 4, 2-гі паверх, пакой 27)
4-га КРАСАВІКА 1933 года . . . А, Б, В, Г, Д—з 18 да 22 гадз.
8 „ „ . . . Е, Ж, З, І —з 18 да 22 гадз.
8 „ „ . . . К, Л, М, Н, О, П, Р—з 10 да 15 і з 18 да 22 гадз.
7 „ „ . . . Усе астатнія —з 18 да 22 гадз.
Пры перарэгістрацыі неабходна абавязкова мець дыплём і вайсковы білет.
Праходзячыя перарэгістрацыю атрымліваюць ад Гарздраву адпаведную даведку.
Тыя, што не перарэгіструюцца, з 10-га красавіка г. г., да працы дапушчаны ня будуць.
МЕНГАРЗДРАЎ.

За наўплату пазыкі Дзяржбанку
ПРАДАЮЦЦА
піламатар'ялы і мэблёвыя вырабы
на суму 50000 руб.
Жадаючым купіць зварачацца ў Барысаўскае аддзяленьне Дзяржбанку.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

Дырэкцыя Клінічнага гарадку абвяшчае конкурс на ардынатуру
для 2-й тэрап. клінікі праф. Гаўсмана, 1-й хірургічнай клінікі праф. Рубашова.
Тэрмін конкурсу 15 красавіка 1933 г.
Заявы накіроўваць па адрасе: Менск, Клінічны гарадок, Барысаўскі тракт.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Друкарні „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБЕН
на стапую працу
ст. БУХГАЛЬТАР.
Савецкая, 63, другі